Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 191 (30071)

ВЫНІШЧЫЦЕ СУМНІК СА СВАЙГО КВЕТНІКА! 7

КНІГА З ГАЛАСАМІ І ЎСПАМІНАМІ 9

КАРОТКА

- **Беларускім бязвізам з пачатку года скарысталіся больш як 340 тысяч іншаземцаў.**
- Беларусь павысіла экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.
- **«Мінсктранс» падрыхтаваў амаль 70 працэнтаў пасажырскага транспарту і 50 працэнтаў тэхнікі да работы зімой.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РАМАШКА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

«У кацельнях арганізацый ЖКГ на сёння выкарыстоўваюцца розныя віды паліва — газ, мясцовыя віды паліва ў выглядзе дроў, пелет, шчапы, нямногія яшчэ выкарыстоўваюць мазут. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай адбываецца пастаянная мадэрнізацыя гэтых кацельняў і перавод іх з неэфектыўных відаў паліва на мясцовыя. Што датычыцца драўнянага паліва, то на сёння ў Беларусі для гэтых мэт нарыхтавана больш як 2 млн куб. м дроў. Гэта на 28 % больш за план. Шчапа нарыхтавана ў аб'ёме 620 тыс. куб. м, што на 13 працэнтаў больш за заданне. Запасаў паліва больш чым дастаткова. Яны дазволяць прайсці гэты ацяпляльны перыяд без дэфіцыту і неабходнасці прыняцця дадатковых рашэнняў. Ніхто не можа прадбачыць, наколькі суровай ці мяккай будзе зіма, таму заўсёды нават запас робіцца з пэўным запасам».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ УЛАДУ»

Прэзідэнт прыняў з дакладам Старшыню Савета Рэспублікі Наталлю Качанаву

Новы працоўны тыдзень Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пачаў з даклада Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. За дзясятую сесію Саветам Рэспублікі разгледжаны і адобраны 101 законапраект, у тым ліку прыняты два законы — «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці». У цэлым прынятыя законы забяспечваюць дзейнае прававое рэгуляванне запатрабаваных беларускім грамадствам і часам пытанняў, адказваюць сучасным выклікам і накіраваныя на перспектыву. СТАР. 2

Фота Белта.

Дзяржаўны інтарэс

УСВЯДОМЛЕНЫ ВЫБАР

Ці модна сёння «купляць беларускае»?

Падводзячы вынікі работы эканомікі нашай краіны ў студзені — жніўні бягучага года, Міністэрства эканомікі канстатавала: спажывецкая актыўнасць беларусаў узрасла. У прыватнасці, значна прыбавіў па выніках 8 месяцаў рознічны тавараабарот. І калі разважаць пра тавары лёгкай прамысловасці, ці можна сцвярджаць, што апошнім часам айчынны спажывец стаў часцей «купляць беларускае»? Ці здольныя ў вачах пакупнікоў айчынныя адзенне, абутак і аксесуары канкурыраваць з замежным масмаркетам? Як спажыўцы ацэньваюць рэчы айчынных марак і да якіх з вытворцаў часцей звяртаюцца? І што намечана зрабіць у найбліжэйшы час, каб узрослы сёння імпульс выбіраць сваё ў беларускага спажыўца не згас? Аб гэтым мы гутарым з намеснікам старшыні канцэрна «Беллегпрам» Наталляй МУРАШКА. СТАР. 5

Сучасніцы

КАЛІ ЛЮБІШ СВАЮ СПРАВУ

Як быць кіраўніком вялікай арганізацыі і маці пяцярых дзяцей

За гады работы не раз даводзілася сустракацца з жанчынамі, якія прысвяцілі сябе сям'і. Выгадаваць пяцёра дзяцей — гэта вам не жартачкі, а сапраўдная праца маці-гераіні. І тут ужо ніякай іншай работы можа і не быць, бо, як сказаў адзін мудры святар, ахвяраваць сябе на служэнне сям'і — само па сабе азначае духоўны подзвіг. Ёсць у маіх журналісцкіх архівах-блакнотах таксама гераіні-працаўніцы, якія аддалі перавагу кар'еры, прафесійнаму росту. А вось каб два ў адным: і вялікая дружная сям'я, і паспяховая работа — вялікая рэдкасць. СТАР. 8

Зацверджаны найважнейшыя параметры на 2024 год

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 кастрычніка падпісаў указ № 307, якім зацверджаны найважнейшыя прагнозныя параметры развіцця краіны на 2024 год, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Галоўнай мэтай эканамічнай палітыкі будучага года будуць забеспячэнне ўстойлівасці эканомікі і рост дабрабыту насельніцтва. Прырост валавога ўнутранага прадукту прагназуецца на 3,8% за кошт маштабных інвестыцыйна-вытворчых праграм, рэалізацыі беларускай прадукцыі на знешнія рынкі і пашырэння ўнутранага попыту.

Чакаецца, што інвестыцыі ў асноўны капітал дададуць 3,9% у супастаўных умовах, экспарт тавараў і паслуг павялічыцца на 7,6% (пераважна за кошт нарошчвання фізічных аб'ёмаў продажаў), рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва прырастуць на 3,5%.

Захаваецца палітыка па стрымліванні цэн. Для гэтага для Нацыянальнага банка і ўрада ўстанаўліваецца мэтавая задача па абмежаванні інфляцыі на ўзроўні, які не перавышае 6%.

У выніку рост рэальнай заработнай платы складзе 103,9%. Намінальная налічаная сярэднемесячная зарплата па краіне павялічыцца да Br2087. У бюджэтным сектары — Br1634.

Для дасягнення найважнейшых параметраў урад зацвердзіць Мэтавы план на 2024 год. У ім будуць сканцэнтраваныя першачарговыя задачы па рэалізацыі вытворчых, экспартных і інвестыцыйных планаў дзяржаўнымі органамі. Устаноўленыя ў ім заданні будуць нацэлены на збалансаваны рост эканомікі без рызыкі справакаваць макраэканамічныя шокі пры спадарожным павышэнні ўзроўню жыцця насельніцтва.

Таксама ў мэтах стварэння ўмоў для ўстойлівага росту эканомікі прыняты ўказ № 308 аб мэтавых паказчыках грашова-крэдытнай палітыкі на 2024 год.

Пералік уключае набор якасных паказчыкаў, здольных забяспечыць устойлівасць банкаўскай сістэмы (у тым ліку як крыніцы інвестыцыйных рэсурсаў), а таксама цэнавую і фінансавую стабільнасць. Да іх адносяцца:

- прырост спажывецкіх цэн — не больш за 6%;
- міжнародныя рэзервовыя актывы — не менш за $ 6 млрд;
- доля неабслугоўваемых актываў банкаў у актывах, схільных да крэдытнай рызыкі, — не больш за 10% (утрыманне такога ўзроўню забяспечыць стабільнасць усёй банкаўскай сістэмы);
- каэфіцыент даступнасці аўтаматызаваных сістэм удзельнікаў плацежнага рынку для забеспячэння правядзення разліковых аперацый — не менш за 99,8% (гэта дазволіць паўнавартасна забяспечыць патрэба рэальнага сектара эканомікі і грамадзян у бесперашкодным правядзенні разлікаў на тэрыторыі краіны);
- прырост патрабаванняў банкаў да эканомікі — не менш за 10%, што пашырыць рэсурсную падтрымку рэальнага сектара, задаволіўшы плацежаздольны попыт на крэдыты, што стане адным з ключавых стымулаў росту эканомікі.

«ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ БАЧЫЦЬ УЛАДУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Найперш Прэзідэнт звярнуў увагу на заканатворчы працэс, у прыватнасці на яго асаблівасці падчас работы верхняй палаты парламента цяперашняга склікання, які правядзіць сваю апошнюю перад выбарамі сесію. «Магчыма, нейкія недахопы, нейкія асаблівасці, якія мы павінны ўлічыць пасля выбараў у будучыні», — заўважыў ён.

Другое пытанне, узнятае кіраўніком дзяржавы, датычыцца экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся: як сябе рэалізаваў гэты досвед, ці не стаў экспертны савет чыноўніцкім або ўрадавым прыдаткам? Экспертны савет пры Савеце Рэспублікі быў створаны для ўсебаковага разгляду праектаў найважнейшых нарматыўных прававых актаў і ацэнкі наступстваў іх прыняцця. «Мы дамаўляліся, што гэта будзе сур'ёзны фільтр з экспертаў па дакументах, якія вы выносіце на разгляд Прэзідэнта. Гэта вельмі важна, каб не разбалансавацца. Таму я думаю, што савет лішнім не будзе і бюракратыі там таксама не павінна быць. Вось гэтага ні ў якім разе нельга дапусціць», — сказаў ён.

Трэцяе пытанне — узаемадзеянне Савета Рэспублікі з мясцовымі Саветамі. «Мы дамаўляліся аб тым, што Савет Рэспублікі возьме пад свой патранаж мясцовыя Саветы. Але гэта ўвогуле зона вашай адказнасці, акрамя заканатворчасці. Бо лепш, чым вы, Савет Рэспублікі, гэтую работу ніхто не зробіць. Як тут ідуць справы? Што трэба зрабіць у будучыні?» — пацікавіўся Прэзідэнт.

Чацвёртае пытанне і, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, вельмі гарачая тэма — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў і Палату прадстаўнікоў. «Я прасіў вас найперш, Адміністрацыю Прэзідэнта, калі трэба, парламент (ніжнюю палату) падключыцца да правядзення гэтых выбараў. Тым больш вы — упаўнаважаны па Мінску. Мінск заўсёды ў нас адрозніваўся нейкай асаблівасцю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў пра размову аб тым, што трэба паглядзець, наколькі гатовы да правядзення выбараў усе органы ўлады, і пры неабходнасці дапамагчы Цэнтральнай выбарчай камісіі. «У нас няма такіх створаных бюракратычных сістэм, адміністрацыйных, якія займаліся б выбарамі, акрамя Цэнтральнай выбарчай камісіі. Астатнія, так сказаць, на аматарскіх пачатках. Таму гэта пытанне трэба трымаць пад кантролем, вопыт у вас ёсць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што інфармаваны наконт работы са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі. «Магу толькі падзякаваць сенатарам за тое, што, як ніякая іншая структура, вы сур'ёзна паставіліся да гэтага пытання. Людзі гэта цэняць, людзі хочуць бачыць уладу, людзі хочуць пагаварыць з прадстаўнікамі ўлады. Мы гэта нядрэнна робім», — сказаў ён. Па інфармацыі Савета Рэспублікі, у сесіённы перыяд сенатарамі праведзена звыш 200 прамых тэлефонных ліній, 360 асабістых прыёмаў грамадзян, каля паловы з якіх выязныя, разгледжана каля 6 тысяч зваротаў.

Наталля Качанава падкрэсліла, што Савет Рэспублікі самым сур'ёзным чынам працуе па кірунках, закранутых Прэзідэнтам, і па многіх іншых. «Для нас вельмі важная работа над законапраектамі. За мінулы перыяд мы разгледзелі 305 нарматыўна-прававых актаў, законапраектаў. За гэты год больш за 100, амаль 92 працэнты законаў прыведзены ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй», — дадала яна.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Дапамагчы людзям мы абавязаны

У размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла, што ў хуткім часе работа па прывядзенні законаў у адпаведнасць з Канстытуцыяй будзе скончана ў вызначаныя тэрміны.

Адной з тэм сустрэчы ў Прэзідэнта стала дзейнасць экспертнага і экспертна-кансультатыўнага саветаў пры Савеце Рэспублікі. Як адзначыла Наталля Качанава, гэта вельмі эфектыўныя структуры. За два гады дзейнасці экспертнага савета праведзена 108 пасяджэнняў, на іх разгледжана 225 дакументаў, з якіх падтрымана 65 (28,9 працэнта). Па 160 дакументах унесены заўвагі (71,1 працэнта), у тым ліку адхілена 13 дакументаў. У пасяджэннях экспертнага савета ўдзельнічаюць кіраўнікі рэгіёнаў, мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, Маладзёжнага парламента, бізнес-супольнасці, грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, навуковых і аналітычных структур, спецыялісты-практыкі, грамадзяне. «У рабоце экспертнага савета могуць прымаць удзел нават проста жыхары нашай краіны, якія часам са сваімі ініцыятывамі, прапановамі звяртаюцца да нас. І мы разумеем, што гэты чалавек глыбока пагружаны ў праблему. Калі мы разглядаем пытанне на экспертным савеце, мы з вялікай радасцю запрашаем усіх, хто мае дачыненне да разгляду дадзенай тэматыкі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна канстатавала, што для дэпутатаў Савета Рэспублікі важная работа з насельніцтвам, работа са зваротамі грамадзян, якой удзяляецца асаблівая ўвага. Прымяняюцца новыя формы, напрыклад, адзіны дзень прыёму грамадзян, калі ўсе сенатары выязджаюць у адну з абласцей і праводзяць прыём па асабістых пытаннях. «Мы бачым, якія праблемы ёсць у людзей, якія ідуць да сенатараў, членаў Савета Рэспублікі для таго, каб агучыць сваю праблему. Ёсць і прапановы, якія датычацца заканатворчай дзейнасці. Для нас гэта асабліва важна. І, вядома, дапамагчы людзям мы абавязаны — гэта наша задача», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. Яна таксама заўважыла, што адзін з асноўных напрамкаў работы сенатараў — работа з дэпутатамі ўсіх узроўняў, бо Савет Рэспублікі выконвае ролю каардынатара ў іх дзейнасці.

Наталля Качанава адзначыла, што зусім няшмат часу засталося да таго, як будзе дадзены старт электаральнай кампаніі, якая пройдзе ў новым фармаце. Гэта будзе адзіны дзень галасавання, што зацверджана ў новай рэдакцыі Канстытуцыі. «Гэта адказны перыяд у жыцці нашай краіны. Я гавару не толькі пра членаў Савета Рэспублікі, але і пра кожнага грамадзяніна краіны. Мы будзем выбіраць дэпутацкі корпус усіх узроўняў, пачынаючы ад сельскіх Саветаў і заканчваючы Саветам Рэспублікі. І, вядома, да гэтай работы трэба падыходзіць адказна. Перш за ўсё, павінны сёння актыўна працаваць у гэтым напрамку мясцовыя органы ўлады — гэта фарміраванне тэрытарыяльных акруг, падрыхтоўка да гэтага важнага палітычнага мерапрыемства», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі. Яна зазначыла, што ў Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны прыйсці людзі, «якія жывуць праблемамі сваёй краіны, якія любяць людзей». Гэта работа вельмі няпростая, бо трэба ўзяць на сябе адказнасць за тых, хто аддаў за цябе голас. І гэта не проста «націскаць на кнопку і прыкалоць значок на грудзі», а жыць праблемамі і радасцямі людзей, бываць у калектывах, праводзіць прыёмы. Наталля Качанава прызналася, што на сваім вопыце ведае: дэпутацкая дзейнасць — гэта вельмі няпроста, але вельмі цікава. «Будучы членам Савета Рэспублікі, ты ўвесь час у гушчы падзей, якія адбываюцца ў тваёй краіне і на міжнароднай арэне. Ты павінен арыентавацца, павінен бачыць, разумець, спачуваць, суперажываць, радавацца. Гэта вельмі няпроста, але цікава. І я жадаю ўсім, хто зробіць такі выбар і захоча стаць дэпутатам, прымаць гэтае рашэнне вельмі ўзважана і абдумана», — сказала яна.

Спікер пацвердзіла, што члены Савета Рэспублікі падключацца да гэтай работы. «Дзесьці са свайго боку дадзім характарыстыку кандыдатам, таму што мы на працягу ўсяго гэтага часу працавалі разам з імі. І тым, хто ўжо быў дэпутатам, і тым, хто захоча стаць ім, каго мы бачылі ў справе. І вось тут важна не памыліцца», — сказала яна.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Варшаве ў маршы пратэсту ўзялі ўдзел каля мільёна чалавек

Маштабны мітынг пратэсту атрымаў назву «Марш мільёна сэрцаў». Гарадскія ўлады Варшавы заявілі, што ў найбуйнейшым за ўсю гісторыю мітынгу ў польскай сталіцы ўзялі ўдзел каля мільёна чалавек. Апытанні грамадскай думкі сведчаць, што ў краіне расце незадаволенасць ростам кошту жыцця і апасенні з нагоды эрозіі дэмакратычных стрыманняў і процівагаў. З меркаванняў бяспекі паліцыя перакрыла некаторыя вуліцы ў цэнтры Варшавы. Мітынгі прайшлі і ў іншых польскіх гарадах. «Будуць вялікія перамены. Гэта прыкмета адраджэння Польшчы», — заявіў лідар апазіцыйнай «Грамадзянскай платформы» і экс-прэзідэнт Еўрапейскага савета Дональд Туск натоўпу, які сабраўся на цэнтральнай плошчы Варшавы. Як паведаміў Euronews, дэманстранты абвінавачваюць кіруючую партыю «Права і справядлівасць» у імкненні вывесці краіну з ЕС, парушэнні свабод, фінансавых махінацыях, абмежаванні правоў жанчын. «Хтосьці вырашыў разбурыць дэмакратыю ў Польшчы», — заявіў удзельнікам мітынгу мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі. Відавочна, што з набліжэннем парламенцкіх выбараў, якія пройдуць у Польшчы 15 кастрычніка, пашыраецца пратэсная хваля. Папярэдні марш, які быў праведзены «Грамадзянскай платформай» 4 чэрвеня, па некаторых ацэнках, сабраў паўмільёна чалавек.

Лідар Нігера заявіў, што французскія ваенныя не здолелі перамагчы тэрарыстаў

Абдурахман Тчыяні заявіў, што французскія ваенныя, якія рыхтуюцца да ад'езду з яго краіны, так і не здолелі дапамагчы перамагчы тэрарызм. «Мала таго, што яны не здолелі перамагчы тэрарызм, дык яшчэ і самі тэрарыстаў стала больш, — цытуюць яго французскія СМІ. — Паколькі французы, якія знаходзіліся ў нас, каб змагацца супраць тэрарызму, у аднабаковым парадку спынілі супрацоўніцтва з намі, то іх знаходжанне ў Нігеры падыходзіць да канца». Паводле яго слоў, улады Нігера «займаюцца падрыхтоўкай» да ад'езду французскіх вайскоўцаў. Тчыяні адзначыў, што ваенныя здзейснілі пераварот у Нігеры якраз таму, што ўлады не прыслухоўваліся да іх меркавання па пытаннях бяспекі краіны. Французскія СМІ адзначаюць, што гэтыя заявы Тчыяні зрабіў журналістам, размаўляючы не на французскай, а на карэнных мовах Нігера.

Закрылася найбуйнейшае газавае радовішча Еўропы

Здабыча газу ў нідэрландскім Гронінгене, дзе размяшчаецца найбуйнейшае ў Еўропе радовішча, днямі завяршылася. Аб гэтым паведаміла Нідэрландская тэлерадыёвяшчальная карпарацыя (NOS). Як вядома, гіганцкае газавае радовішча ў Гронінгене на поўначы Нідэрландаў было адкрыта ў 1959 годзе, яго распрацоўка пачалася ў 1963-м. Пачатковыя запасы газу тут складалі 2,9 трыльёна кубаметраў. На працягу многіх гадоў радовішча было асноўнай крыніцай газазабеспячэння Паўночна-Заходняй Еўропы, аднак з-за шматлікіх землятрусаў у 1990-х улады Нідэрландаў вырашылі паступова абмежоўваць здабычу. У апошнія месяцы з 26 аб'ектаў радовішча працавалі толькі пяць. У выніку спыніліся і яны. Аднак мясцовыя жыхары ставяцца да гэтай весткі з недаверам і лічаць, што здабыча можа быць адноўлена. Па запэўненнях урада, гэта можа адбыцца толькі ў складаных сітуацыях — «напрыклад, калі наступнай зімой некалькіх дзён будзе мароз звыш 6,5 градуса на працягу дня».

Ураджай-2023

У заліку — больш за паўмільёна

Аграрыі Віцебшчыны падвялі ўрачыстую мяжу ўборачнай кампаніі — 2023 абласным святам працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Сёлета паўночны рэгіён сабраў рэкордныя для гэтага года 624 тысячы тон збожжа і нарыхтаваў максімум збожжасенажу. Канчатковыя ўборачныя вынікі вобласць падвядзе ў лістападзе, 261 экіпаж хлебаробаў дасягнуў намалоту ў тысячу тон, 26 — узялі двухтысячную вяршыню, Максім СЯРНОЎ з ААТ «Агракамбінат «Юбілейны» Аршанскага раёна адзіны ў рэгіёне намалаціў звыш трох тысяч тон.

Фота БелТА.

«Дажынкі» ў Шаркаўшчыне пачаліся з ушанавання памяці герояў-вызваліцеляў, якія абаранялі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета шаркаўчане адзначаюць і 520-ю гадавіну з дня заснавання пасёлка. На старонках яго летапісу былі і радасці росквіту, і горыч ваеннай навалы. Кіраўніцтва вобласці і шматлікія госці схілілі галовы ў хвіліне маўчання каля брацкай магілы на гарадской плошчы і ўсклалі кветкі ў памяць воінаў.

Галоўнае аграрнае свята Шаркаўшчына чакала даўно, як і яе жыхары, бо гэта не толькі вялікі гонар, але і свежы глыток паветра для інфраструктуры і ўстаноў. Так, да «Дажынак» абнавіліся 180 аб'ектаў, у ліку якіх — сярэдняя школа № 1. Ва ўстанове, якая адзначае 50-годдзе, быў праведзены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй, і на свяце яна атрымала статус «Школа будучыні». Урачыста адкрылі новы 40-кватэрны дом для маладых спецыялістаў і тых грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта першы дом у Шаркаўшчыне, у якім ёсць ліфт — доўгачаканая для ўсіх жыхароў падзея. Да абласных «Дажынак» на Віцебшчыне ў абноўленым будынку Шаркаўшчынскага раёна электрычных сетак адкрыўся разлікова-касавы цэнтр РУП «Віцебскэнерга». У мерапрыемстве ўзяў удзел **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ**. Вядуцца работы па мадэрнізацыі спартыўнай пляцоўкі, раённага Цэнтра рамёстваў, Цэнтра культуры, іншых важных аб'ектаў. Абноўлены фасады будынкаў кансервавага завода, гасцініцы, камбіната бытавога абслугоўвання, аўтастанцыі, пошты, цэнтра банкаўскіх паслуг, архіва. Каля ўсіх будынкаў добраўпарадкаваны прылеглыя тэрыторыі, адрамантаваны дарогі, пакладзена 155 тысяч квадратных метраў асфальтавага пакрыцця. Праведзены рамонт 27 прыдамавых тэрыторый, 12 аб'ектаў гандлю спажывецкай кааперацыі, 22 суб'ектаў прыватнай формы ўласнасці, добраўпарадкавана тэрыторыя рынку, адкрыта новае кафэ.

«Усё, што зроблена, застаецца людзям. І гэта галоўнае. Ператварэнне гарадскога пасёлка працягнецца і пасля фестывалю», — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**. Так, у пачатку 2024 года будзе ўведзены ў эксплуатацыю новы корпус Аляксандраўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў. Будзе адкрыты мост па вуліцы Краснадарскай, працягнецца капітальны рамонт раённага цэнтра культуры. Для прыхільнікаў здаровага ладу жыцця і аматараў спорту будзе пабудаваны шматфункцыянальны фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

Гаворачы аб ператварэнні сталіцы цяперашніх «Дажынак» — Шаркаўшчыны, — старшыня аблвыканкама выказаў словы падзякі і ўдзячнасці будаўнікам, работнікам камунальных службаў, дарожнікам — усім, хто ўдзельнічаў у падрыхтоўцы райцэнтра да свята.

Па абодвух берагах ракі раскінуліся інтэрактыўныя пляцоўкі і гасцінныя падворкі ўстаноў і арганізацый вобласці. Тут была прадстаўлена рэтра- і сучасная сельскагаспадарчая тэхніка, але найбольш уразіў аўдыторыю, асабліва дзіцячую, цукеркавы дождж з камбайна. Не абышлося без галоўнага сімвала жніва — паўтараметровага пяцяруснага каравая з мукі новага ўраджаю.

На галоўнай сцэне свята адбылася цырымонія ўзнагароджання найлепшых аграрыяў паўночнага рэгіёна, якія сёлета дасягнулі высокіх сельскагаспадарчых вынікаў. З прывітальным словам да хлебаробаў і гасцей звярнуўся Аляксандр Субоцін. «Сучасны Шаркаўшчынскі раён — гэта ў першую чаргу сельскагаспадарчы раён. Сельскі ўклад жыцця падарыў гэтай мясцовасці тонкае зачараванне глыбінкай, дзе ўмеюць шанаваць працу на зямлі і аддаваць гонар сабранаму ўраджаю. Мы працуем ва ўмовах рызыкоўнага земляробства — спадзявацца і чакаць падарунка ад прыроды не варта. Умовы гэтага года яшчэ раз пацвердзілі, што найлепшы вынік атрымлівае той, хто больш строга выконвае тэхналогію, шырока выкарыстоўвае дасягненні аграрнай навукі, прымяняе высокаўраджайныя сарты культур, працуе на высокапрадукцыйнай тэхніцы. Сацыяльна-эканамічная стабільнасць дзяржавы падмацоўваецца харчовай бяспекай, яна залежыць ад укладу кожнага, ад умення любіць сваю справу і сваю Радзіму. Сельская гаспадарка служыць сыравіннай асновай для прадпрыемстваў харчовай, лёгкай прамысловасці, на долю якіх прыпадае амаль чвэрць аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі вобласці. Дзейнасць усіх асноўных сфер эканомікі Віцебшчыны прыбытковая, а прадукцыя прадпрыемстваў запатрабаваная. Паважаныя аграрыі, ваша праца мае вялікае значэнне для развіцця эканомікі вобласці і сацыяльнай стабільнасці ў рэгіёне. Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, поспехаў у дасягненні пастаўленых мэт і завяванні новых вышынь! Міру і дабрабыту!»

Прывітальны адрас **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігара СЕРГЕЕНКІ** зачытаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксей ГУЙДА.**

Ганаровыя граматы і падзякі атрымалі перадавікі сельскагаспадарчай нівы вобласці, у іх ліку — працаўнікі прадпрыемстваў, якія з году ў год маюць высокія вынікі па намалоце збожжа: ААТ «Хацілягра» і «Навасёлкі-Лучай» Пастаўскага раёна; СВК «Ларынаўка» Аршанскага раёна; Талачынскі кансервавы завод; Віцебская бройлерная птушкафабрыка; ААТ «Шайцерава» Верхнядзвінскага раёна; «Мазалавагаз» Віцебскага раёна.

Яркім акордам першага дажыначнага дня стаў канцэрт Анатоля Ярмоленкі і ансамбля «Сябры», вечарам неба над пасёлкам зазяла агнямі салюту.

У наступным годзе абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі пройдзе ў гарадскім пасёлку Бешанковічы. А гэта значыць, здзейсніцца новы рывок у трансфармацыі інфраструктуры і грамадскіх прастор.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Сталічны час

Жыллё для шматдзетных і арэнднае

Учора на аператыўнай нарадзе ў Мінскім гарвыканкаме абмяркоўвалі жыллёвыя пытанні

У прыватнасці, аб выніках забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў сталіцы расказала начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ.

Фота БелТА.

Дынамічна зніжаецца чарга шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля ў сталіцы. Цяпер у гэтай чарзе стаяць 4374 шматдзетныя сям'і, з іх сталі на ўлік сёлета 652. Як адзначыла Алена Лукашэвіч, доўгія гады гэтая колькасць складала 1—1,3 тысячы сем'яў.

«Сёння 2628 шматдзетных сем'яў паляпшаюць жыллёвыя ўмовы, 1288 адмовіліся ад прапанаваных варыянтаў паляпшэння жыллёвых умоў», — удакладніла начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама.

Сярод распаўсюджаных прычын адмовы — незадаволенасць раёнам будаўніцтва жылля. Да нядаўняга часу вострай праблемай для шматдзетных сем'яў была абавязковая купля паркавальнага месца пры набыцці кватэры. Цяпер гэта праблема вырашылася. Амаль 70 працэнтаў шматдзетных сем'яў, якія ўжо маюць ва ўласнасці жыллё, не маюць сродкаў на даплату для будаўніцтва поўнагабарытнай кватэры па нарматыве, паколькі дзяржпадтрымка даецца за вылікам памеру існуючай уласнасці.

Паводле слоў Алены Лукашэвіч, шматдзетныя сем'і паляпшалі жыллёвыя ўмовы шляхам долевага будаўніцтва ў Мінску, Смалявічах і іншых гарадах з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек, забяспечваліся сацыяльным жыллём, ім таксама былі прададзены кватэры ў Мінску і Смалявічах. «Найбольш папулярны продаж. Людзі з задавальненнем згаджаюцца на ўжо гатовыя кватэры. Гэта дазволіла нам накіраваць на паляпшэнне жыллёвых умоў 1064 сям'і, на гэтыя мэты выкарыстана 1190 кватэр, паколькі вялікім сем'ям з колькасцю больш за дзевяць-дзесяць чалавек прадастаўлялася па дзве кватэры», — растлумачыла начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама.

Як вынік — Мінгарвыканкам перавыканаў прагнозны паказчык. За справаздачны перыяд стаяла задача забяспечыць жыллём 1 тысячу шматдзетных сем'яў. На сёння фактычнае выкананне складае 106,4 працэнта. «Работа ў гэтым напрамку будзе прадоўжана. Да канца года мы ўвядзём яшчэ каля 1 тыс. кватэр, будзем аддаваць шматдзетным сем'ям», — сказала Алена Лукашэвіч.

У 2023 годзе ўстойлівым попытам у сталіцы карыстаецца арэнднае жыллё. Як растлумачыла Алена Лукашэвіч, у адпаведнасці з заканадаўствам 60 працэнтаў усяго вызваленага або пабудаванага арэнднага жылля даецца чаргавікам агульнай групы, 10 працэнтаў накіроўваецца на забеспячэнне жыллём ваеннаслужачых дзяржаўных органаў і 30 працэнтаў выдзяляецца для патрэб першачарговых катэгорый па месцы працы. На сёння першачаргавікам у сталіцы ўжо дадзена 55 жылых памяшканняў, 85 кватэр выдзелена чаргавікам па месцы працы і 80 кватэр аддадзена для патрэб чаргавікоў агульнай чаргі.

Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама заўважыла, што ажыццяўляецца будаўніцтва 147 новых арэндных кватэр у жылых дамах у мікрараёне Сокал і на вул. Акадэміка Купрэвіча.

Расказваючы аб тым, якіх вынікаў удалося дасягнуць у рабоце па паляпшэнні жыллёвых умоў чаргавікоў Мінска, як тых, хто стаіць на ўліку па месцы жыхарства ў адміністрацыях раёнаў, так і тых, хто стаіць на такім уліку па месцы працы або службы, Алена Лукашэвіч падкрэсліла, што ў прыярытэце дзяржаўнай увагі працягваюць заставацца шматдзетныя сем'і і ваенныя. Выходзячы з гэтага, і адбывалася размеркаванне жылых памяшканняў.

Так, у аб'ектах Мінска для чаргавікоў адміністрацый раёнаў была прадугледжана 1371 кватэра, у малых гарадах і Смалявічах — 188 кватэр. Па месцы работы ў дзяржаўных органах, на прадпрыемствах і ў арганізацыях сталіцы атрымалі магчымасць пабудаваць жыллё 495 сем'яў, у Смалявічах — 88 работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый Мінска.

Паводле БелТА.

ВЕТЭРАНЫ — ГЭТА НЕ ЎЗРОСТ, ГЭТА ДОСВЕД

Чэмпіёнскія ўрокі ад старэйшага пакалення спартсменаў

Сёлета Дзень пажылых людзей супаў з Днём настаўніка, што надзвычай сімвалічна. Бо хто, як не людзі шаноўнага ўзросту, могуць навучыць моладзь не толькі вучэбным прадметам, але і жыццёвым тонкасцям. Хто лепей за іх можа перадаць свой досвед і веды не дзеля адзнак, а для таго, каб маладое пакаленне стала лепшым за папярэдняе і магло спраўляцца з выклікамі, абапіраючыся на прыклад старэйшых. У спорце гэта працуе бездакорна. Так, спаборніцтвы, канкурэнцыя і падыходы да трэніровак мяняюцца пастаянна, але трэніроўкі сілы духу, настрой на барацьбу і адказнае стаўленне да сваёй працы ў спорце неабходныя ва ўсе часы. Маладым спартсменам пашанцавала, пра ўсё гэта ім могуць расказаць старэйшыя калегі, што і адбылося падчас сустрэчы актыву грамадскага аб'яднання «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» з навучэнцамі Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву.

«Вельмі важна, што ў нашай краіне адзначаюць Дзень пажылых людзей. Гэта даніна павагі да людзей сталага веку. Маёй маме нядаўна споўнілася 97 гадоў, і я схіляюся перад тым, што зроблена ёй, схіляюся перад нашымі ветэранамі спорту», — адзначыла **Антаніна КОШАЛЬ, старшыня ГА «Ветэраны фізічнай культуры і спорту», першая алімпійская чэмпіёнка, выпускніца РГУАР**. Яна расказала, што падчас яе вучобы ў вучылішчы алімпійскага рэзерву ўмовы для трэніровак былі далёка не такімі, як цяпер. Пра гэта ведаюць і многія іншыя алімпійскія чэмпіёны. Антаніна Кошаль пажадала маладым спартсменам шанаваць тое, што яны маюць, і не забываць прыслухоўвацца да дарослых.

На сустрэчы прысутнічала і **старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццяна ФІЛІМОНАВА**: «Ветэраны — гэта не колькасць гадоў, указаных у пашпарце. Ветэраны — гэта людзі, якія могуць ганарыцца сваім вопытам. Не кожнаму спартсмену-пачаткоўцу пашчасціць пазнаёміцца з легендамі спорту», — сказала яна. Асобна Таццяна Філімонава звярнулася да маладых спартсменаў: «Гэта ўнікальныя людзі, яны сталі алімпійскімі чэмпіёнамі, калі адной сотай часткі таго, што сёння ёсць у нашай краіне, не было. І яны могуць з поўнай упэўненасцю сказаць, што ў вас ёсць усё, каб таксама прыйсці да перамогі і праславіць нашу краіну. Я ўпэўнена, што ўсё ў вас атрымаецца. Тым больш ёсць такія людзі, якія гатовыя і шчаслівыя перадаваць свой вопыт».

Беларуская алімпійская акадэмія прапанавала ветэранам спорту ўбачыць свае значныя выступленні, а маладым спартсменам паказала, на што былі здольныя савецкія спартсмены. «Моладзь — гэта будучыня. А будучыня залежыць ад таго, якія каштоўнасці мы закладзём у наша маладое пакаленне. І вось гэтая пераемнасць пакаленняў, якую мы сёння назіраем паміж спартсменамі, я ўпэўнена, станоўча паўплывае на нашу моладзь. І вельмі прыемна, што ў нашых маладых спартсменаў ёсць магчымасць пераймаць бясцэнны вопыт старэйшага пакалення з першых вуснаў, з першых рук», — падкрэсліла **Наталля АПАНЧУК, дырэктар Беларускай алімпійскай акадэміі**. Кадры хронікі перанеслі ўдзельнікаў сустрэчы ў мінулае, выклікалі лёгкую настальгію ў дарослага пакалення і мноства пытанняў у пакалення маладога. Сустрэча аказалася душэўнай і ў той жа час карыснай, бо юныя спартсмены атрымалі сапраўдныя чэмпіёнскія ўрокі, якія будуць карысныя не толькі ў спорце.

Антаніна Кошаль — мэтанакіраванасць і псіхалагічная ўстойлівасць

У алімпійскай чэмпіёнкі па спартыўнай гімнастыцы 1972 года паціскавіліся, якімі якасцямі павінен валодаць чэмпіён. Найперш яна назвала мэтанакіраванасць, якая дазваляе пераадольваць усе цяжкасці. Расказала, што для таго, каб адабрацца на алімпійскія спаборніцтвы па спартыўнай гімнастыцы, трэба было прайсці мноства выпрабаванняў. Нават прыехаўшы ў Мюнхен у 1972 годзе, Антаніна Кошаль да апошняга не ведала, ці будзе яна ўдзельнічаць у спаборніцтвах. Але мэтанакіраванасць і працаздольнасць прывялі яе ў шасцёрку найлепшых гімнастак Савецкага Саюза, а затым і на алімпійскі п'едэстал.

Аляксандр Раманькоў — патрыятызм

Сустрэча з ветэранамі спорту аказалася вельмі шчаслівай для спартсменаў, якія вучацца на аддзяленні фехтавання: яны сустрэліся з Аляксандрам Раманьковым, алімпійскім чэмпіёнам, двухразовым сярэбраным і двойчы бронзавым прызёрам Алімпійскіх гульняў па фехтаванні. Як пажартаваў Аляксандр Анатольевіч, з моманту свайго алімпійскага трыумфу ў 1988 годзе ён не зусім не змяніўся. Алімпійскі чэмпіён даў маладым спартсменам урок патрыятызму. «Калі я працаваў у Аўстраліі, мне прапанавалі памяняць грамадзянства. Але пасля майго адказу да мяне з такімі пытаннямі ніхто не падыходзіў. Я сказаў, што мая родная Беларусь ні ў чым перада мной не вінаватая, гэта я ёй вінен за тое, што яна выхавала і за тое, што яна для мяне зрабіла», — расказаў ён. Асобную параду Аляксандр Анатольевіч даў і юным фехтавальшчыкам: «У фехтаванні галоўнае — зрабіць усё своечасова. А з якой хуткасцю — няважна». Прынамсі, каштоўная парада не толькі для фехтавання.

Леанід Тараненка — падтрымка блізкіх

З нядаўняга чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы беларуская каманда вярнулася ўсяго з адным медалём. Вынік не сказаць, каб надта добры. Але ў гісторыі айчыннай штангі ёсць сапраўды слаўныя старонкі. Адна з іх звязана з імем алімпійскага чэмпіёна 1980 года Леаніда Тараненкі. У 1988 годзе ён устанавіў сусветны рэкорд у штуршку — 266 кг, які пратрымаўся 33 гады і 3 месяцы. Гэта адзін з самых працяглых рэкордаў у гісторыі сусветнага спорту. Адказваючы на пытанне, як яму ўдалося прыйсці да такіх вынікаў, Леанід Тараненка расказаў, што ў яго была вельмі моцная падтрымка. «Ва Уладзіміра Высоцкага ёсць такія словы: «Падняцца па крутой спартыўнай лесвіцы мне дапамаглі мой трэнер, калектыў і мая сям'я». У мяне было ўсё менавіта так. Самае галоўнае — гэта трэнер, які вядзе спартсмена, і сям'я, якая яго падтрымлівае».

Сяргей Макаранка — працаздольнасць

Першы алімпійскі чэмпіён у гісторыі беларускага спорту, алімпійскі чэмпіён 1960 года ў веславанні на байдарках і каноэ Сяргей Макаранка расказаў, што дасягнуць спартыўных вяршынь яму дапамагла працаздольнасць. Жыццё алімпійскага чэмпіёна пачалося з вайны, бацька будучага спартсмена загінуў падчас абароны Брэсцкай крэпасці. У пасляваенны час умоў для заняткаў спортам не было ніякіх, а маладому хлопцу трэба было дапамагаць маці. «Я прайшоў вялікі працоўны шлях, быў матросам на рудавозе, рабочым на заводзе. Аднак займацца я хацеў толькі веславаннем і таму абраў для сябе спорт асноўным заняткам. І той досвед, які я атрымаў падчас працы на рудавозе і на заводзе, быў вельмі карысным і ў спорце, бо я ведаў, што такое праца», — прызнаўся чэмпіён.

Аляксандр Кедзяроў — адказнасць

Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 1976 года па кулявой стральбе адзначыў, што ў гэтым спорце галоўнае — канцэнтрацыя, а ў жыцці — адказнасць. І часта, па яго словах, адно без другога не існуе. «Каб перамагчы мандраж перад спаборніцтвамі ці важным экзаменам, трэба: першае — засяродзіцца на сабе; другое — адэкватна рэагаваць на знешнюю інфармацыю», — расказаў Аляксандр Кедзяроў. — Ёсць такія паняцці, як «хачу» і «трэба». І перамагаць будуць тыя, хто кіруюцца паняццем «трэба». А калі гэта падмацоўваецца марай, то ўсё абавязкова атрымаецца».

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Надвор'е

Пакуль цёпла, але напрыканцы тыдня магчымы нават мокры снег

У большай частцы гэтага тыдня надвор'е абяцае быць ветраным і няўстойлівым з перыядычнымі дажджамі, але ўсё ж такі захаваецца цяпло працяглага бабінага лета. Але менавіта ў кастрычніку перад намі адкрываецца дажджлівая восень. А ў самым канцы тыдня, пры паступленні чарговай порцыі халоднага паветра з паўночных шырот, па паўночна-ўсходняй палове краіны чакаецца нават мокры снег, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак пераважна па паўночна-ўсходняй палове краіны чакаюцца дажджы. Вецер паўднёва-заходні ўначы ўмераны, удзень парывісты, месцамі парывамі да 15—20 м/с. Калі ўначы будзе ўжо досыць холадна, то ўдзень — досыць камфортна — 20—25 градусаў.

А ў сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты, ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі парывы ветру будуць дасягаць 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—16 градусаў, а ўдзень — ад 14 градусаў на паўночным захадзе да 22 цяпла на паўднёвым усходзе краіны.

Кароткачасовыя дажджы чакаюцца і ў чацвер. Яны будуць ісці ноччу па поўначы, а днём — пераважна па паўночна-заходняй палове краіны. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты, удзень у асобных раёнах узмоцніцца да 15—20 м/с. Уначы тэмпература апусціцца да 4—11 градусаў, а ўдзень падымецца да 13—20 цяпла.

Першая хваля восеньскага холаду «прыляціць» да нас ужо ў пятніцу. У гэтыя суткі ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Вецер заходняй чвэрці парывісты, месцамі ўзмацненне да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 6 да 11 градусаў. Днём тэмпература павысіцца да 8—15, а па паўднёвым захадзе месцамі да плюс 17 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, больш халодныя ночы чакаюцца ў суботу і ў нядзелю. У суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер заходняй чвэрці парывісты, месцамі чакаецца ўзмацненне да 15—20 м/с. Уначы слупкі тэрмометра пакажуць 4—10 градусаў, па ўсходзе — 1—3, а ў асобных раёнах прагназуюцца замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў. Днём сіноптыкі абяцаюць плюс 7—14, а па поўдні — 15—17 градусаў.

Халодныя і кароткачасовыя дажджы чакаюцца і ў нядзелю, а па паўночна-ўсходняй палове краіны магчымы мокры снег. Вецер заходні, паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—8 градусаў, а ўдзень — 3 цяпла на паўночным усходзе да плюс 16 градусаў на паўднёвым захадзе краіны.

Пакуль халаднавата, будзем чакаць позняга бабінага лета ў сярэдзіне кастрычніка...

Сяргей КУРКАЧ.

УСВЯДОМЛЕНЫ ВЫБАР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларусы сёння пачалі часцей выбіраць адзенне і абутак ад айчынных вытворцаў. Гэта адзначаюць і самі пакупнікі, і спецыялісты канцэрна «Беллегпрам», які аб'ядноўвае найбуйнейшыя прадпрыемствы лёгкай прамысловасці краіны. І хоць шмат у чым цяпер канцэрн арыентуецца на знешні гандаль, «родны» пакупнік не застаецца без увагі: доля продажаў прадпрыемстваў канцэрна на ўнутраным рынку захавалася па шэрагу пазіцый, а па некаторых ёсць рост.

— Наталля Анатольеўна, як сёння ў беларускага спажыўца справы з даверам да айчыннай вопраткі і абутку?

— Мы можам назіраць усвядомлены рост любові да айчыннай прадукцыі. Нашы суайчыннікі вучацца паважаць уласны прадукт, ганарыцца ім. Па ўсім свеце патрыятызм да прадукцыі айчынных вытворцаў — у тым ліку да тавараў лёгкай прамысловасці, у прыватнасці да адзення і абутку, — шмат у чым мерка цывілізаванага, паспяховага грамадства. І наша грамадства паступова прыходзіць да гэтага ўсведамлення. Былі часы, калі пра беларускае адзенне, абутак, аксесуары прынята было ў самой Беларусі гаварыць з іроніяй, у той час як за мяжой, у цэлым шэрагу краін, з цяплом і павагай ужо тады ставіліся і працягваюць ставіцца да беларускай прадукцыі. Асабліва да тавараў лёгкай прамысловасці, дзякуючы ў першую чаргу таму ўзроўню якасці, які мы заявілі першапачаткова і планку гэтую ніколі не зніжалі. А дадаўшы сюды паступовы, але няўхільны рост і асартыменту, і актуальнасці адзення, абутку, галантарэі, сёння мы можам з гонарам прадстаўляць сваю прадукцыю, скажам шчыра, дастаткова распешчанаму і прыдзірліваму беларускаму пакупніку. «Беларускае» для беларусаў больш не асацыіруецца з нечым неактуальным і нямодным, і, я лічу, гэта, безумоўна, перамога.

Усвядомленасць тут — ключавое слова, падкрэслівае суразмоўніца. Наш пакупнік навучыўся лічыць грошы і зразумеў, што пры супастаўляльнай якасці беларускіх мадэляў і замежных аналагаў з масмаркета цана на беларускае адзенне і абутак ніжэйшая. А з дзвюх падобных або аднатыпных рэчаў аналагічнага кошту беларускі брэнд гарантуе больш высокую якасць. Так і ўзнікла хваля цікавасці да айчыннага адзення і абутку, якую мы назіраем сёння. Справа ў тым, што ва ўсім свеце (і Беларусь не выключэнне) спажыванне становіцца ўсё больш абдуманым: не колькасць, а якасць. І беларускія вытворцы ў гэтай сітуацыі відавочна выйграюць, гаворыць яна.

— Ёсць і яшчэ адзін важны нюанс. Мы заўважылі, што ўсё часцей нашы спажыўцы выбіраюць айчынныя тавары і з меркаванняў патрыятызму. Людзі сталі разумець, што тым самым яны падтрымліваюць беларускую эканоміку. Гэта таксама вельмі станоўчая тэндэнцыя. Ну, а мы ў сваю чаргу імкнёмся ісці ў нагу з часам і задавальняць запыты самага пераборлівага пакупніка.

Свая ніша

Сёння ўнікальны час для лёгкай прамысловасці Беларусі, адзначаюць прадстаўнікі канцэрна: час дае шанц павялічыць сваю прысутнасць на цэлым шэрагу

новых знешніх рынкаў. Тавары прадпрыемстваў-членаў канцэрна пастаўляюцца ўжо ў паўсотні краін свету, экспартуецца каля 70 працэнтаў вырабленай на прадпрыемствах канцэрна прадукцыі. Але размова ідзе не толькі аб продажах, але і аб супрацоўніцтве: новых праектах, брэндах, калабарацыях з замежнымі партнёрамі. Гэта значны штуршок да развіцця, вынікі якога зможа ацаніць і беларускі пакупнік.

— Мы заўсёды разумелі важнасць знешнеэканамічнай дзейнасці і супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, але сёння развіваем гэтыя сувязі не толькі шляхам узаемнага гандлю, але і вытворчай кааперацыі, — распавядае Наталля Мурашка. — Возьмем для прыкладу Узбекістан. Сёння многія беларускія прадпрыемствы адшываюць сваю прадукцыю на пляцоўках ва Узбекістане. Напрыклад, ЗАТ «Мілавіца» са студзеня гэтага года размяшчае заказы на вытворчасць гатовых вырабаў на прадпрыемствах Рэспублікі Узбекістан (з пачатку года выканана заказаў на 86 тыс. долараў ЗША). Гэты кірунак супрацоўніцтва асвойваюць «Світанак», «Калінка», «Камволь», «Аршанскі льнакамбінат» і іншыя прадпрыемствы. Не сакрэт, што ў беларускай лёгкай прамысловасці ёсць пэўны недахоп швачак. Гэта не толькі наша праблема — тая ж сітуацыя, напрыклад, у суседняй Расіі. Іншымі словамі, такое супрацоўніцтва выгаднае і ўзбекскаму, і беларускаму бакам. Акрамя таго, зацікаўлены мы і ў пастаўках з Узбекістана баваўнянай пражы, палотнаў баваўны, таму што ў нас проста няма гэтай прадукцыі: у Беларусі не расце баваўна.

Яшчэ адна прыкмета сённяшняга дня — імкненне дзяліцца кампетэнцыямі, адзначае намеснік дырэктара канцэрна «Беллегпрам». Абмен кампетэнцыямі, узаемадапамога ў наладжванні вытворчых працэсаў — магутны рухавік развіцця.

— У сувязі з гэтым не магу не спытаць аб прынцыпова новым кірунку супрацоўніцтва — дызайнерскім.

— У рамках Беларуска-ўзбекскага жаночага форуму адбыўся модны паказ, дзе нараўне з беларускімі калекцыямі дэманстравалася таксама прадукцыя лёгкай прамысловасці Узбекістана. І таксама падчас форуму дызайнерскі цэнтр «Леманграс» (ААТ «Камволь») падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з адным з узбекскіх дызайнерскіх цэнтраў. Такім чынам, мы ўступаем у новую стадыю адносін. Да нядаўняга часу мы не супрацоўнічалі з гэтай краінай у сферы дызайну, ды там ёсць цікавыя ідэі і імёны. Так што і ў частцы моды нас чакае новы этап развіцця.

Але, зразумела, асноўная сфера для паглыблення і пашырэння супрацоўніцтва — гэта гандаль, падкрэслівае суразмоўніца. І адзін з новых рынкаў, якія асвойвае беларускі легпрам сёння, — Казахстан.

— Тут у нашых краін, скажам так, вельмі ўзаемавыгадная сітуацыя: Казахстан практычна не вырабляе тавары лёгкай прамысловасці. Уласная вытворчасць там задавальняе ўсяго 3—5 % рынку, усё астатняе імпартуецца — у першую чаргу з Кітая. Спробы зайсці на гэты рынак са сваім таварам мы рабілі не першы год, сёння ўжо пастаўляем туды і тканіны, і гатовае адзенне. І прыйшоў час пашырыць там прысутнасць беларускіх тавараў. Канкурыраваць па кошце з кітайскімі таварамі мы не збіраемся — у нас няма такой мэты. Мы зоймем адмысловую нішу. Наша мэта, як і на любым знешнім рынку, ды і на ўнутраным, — гэта сярэдні цэнавы сегмент. Хачу падкрэсліць: якасны прадукт танным быць не можа ў прынцыпе. Ды мы і не імкнёмся вырабляць танны прадукт. Гэта азначала б зменшыць планку якасці, а для нас гэта недапушчальна.

— Відавочна, што Расія сёння адкрытая для беларускіх вытворцаў тавараў лёгкай прамысловасці: сітуацыя, якая склалася, дала ім магчымасць выйсці з ценю заходніх сеткавых рытэйлераў...

— У Расіі цяпер беларускія тавары лёгкай прамысловасці вельмі запатрабаваныя. А ў цені замежных брэндаў мы на расійскім рынку ніколі не былі, у нас, паўтаруся, ёсць свая ніша. Беларускі прадукт у Расіі заўсёды любілі не менш, чым заходні. У нас ужо склаўся свой пакупнік. І беларускі трыкатаж, і беларускі тэкстыль заўсёды быў каштоўны для расійскага спажыўца, да яго ставіліся ў Расіі з павагай. Заўважу, што само словазлучэнне «Беларускі трыкатаж» у многіх краінах свету ўжо стала брэндам, хоць брэнд гэты і не мае афіцыйнай рэгістрацыі. «Мілавіца», ELEMA, «Беларускі лён», «Блакіт», «Світанак», «Палессе» — гэтыя назвы цалкам заслужана і абгрунтавана асацыіруюцца ў пакупнікоў многіх краін з якасцю, бяспекай, экалагічнасцю.

Чаго не хапае?

Але вернемся да беларускага спажыўца, бо менавіта айчынны спажывец і яго ўстойлівы выбар — маркер поспеху вытворцы.

— Як зацікавіць сёння нашага пакупніка, улічваючы, што з нашага рынку, у адрозненне ад расійскага, большасць заходніх брэндаў масмаркета не сышлі?

— У Беларусі ёсць брэнды, якія пакупніку прадстаўляць не трэба. Яны агульнавядомыя, яны на слыху, пакупнікі выбіраюць іх прадукцыю на працягу дзесяцігоддзяў. «Мілавіца», «Белвест», «Галантэя», «Контэ Спа», «Аршанскі лён»... Думаю, гэты спіс лёгка працягне кожны, хто жыве ў Беларусі. І адзін з новых напрамкаў развіцця менавіта падачы нашых тавараў пакупніку — мультыбрэндавыя прасторы, якія мы пачалі адкрываць яшчэ ў мінулым годзе. Гэта, напрыклад, агульнавядомая пляцоўка «Дадому», дзе прадстаўлена прадукцыя мноства прадпрыемстваў нашай краіны, аб'яднаная агульнай канцэпцыяй: хатняя ўтульнасць і сямейнае шчасце. Сёння ў Беларусі адкрыты ўжо другі такі канцэпт-стор (першы — у Dana Mall, другі — у ГЦ «Сталіца»), і далей мы будзем

адкрываць гэтыя крамы ў Расійскай Федэрацыі. Мультыбрэндавыя крамы пад сваёй маркай адкрываюць «Conte Спа», «Світанак» — там яны рэалізоўваюць прадукцыю і іншых беларускіх прадпрыемстваў.

А калі казаць непасрэдна пра моду, адзначае суразмоўніца, то гістарычна склалася так, што ў Беларусі ёсць буйныя прадпрыемствы, якія забяспечваюць, так бы мовіць, больш спакойны модны запыт, і лакальныя вытворчасці — дызайн-студыі, што працуюць на стварэнне акцэнтных і ўльтрамодных рэчаў.

— У нашай краіне каля 2000 арганізацый, якія займаюцца вытворчасцю тавараў лёгкай прамысловасці і адносяцца да малога і сярэдняга бізнесу — яны ў большай ступені арыентаваны на апошнія модныя павевы. Моды ў гэтым разуменні ў нас шмат — тут лідзіруюць Брэсцкі і Гродзенскі рэгіёны. Буйныя прадпрыемствы, якія ўваходзяць у канцэрн, у прынцыпе не арыентуюцца на ўльтрамодныя тэндэнцыі, яны бачаць сваю задачу ў стварэнні якаснага «базавага» гардэроба, рэчаў, якія будуць актуальныя не адзін сезон. Але і на буйных прадпрыемствах працуюць вядомыя, знакамітыя дызайнеры, і адзін з актуальных трэндаў апошніх гадоў у буйных вытворцаў — выпуск капсульных калекцый (ад 5 да 10 прадметаў адзення, аб'яднаных агульнай ідэяй). Гэты падыход бачым, напрыклад, у ELEMA, у «Калінкі». Так што, у прынцыпе, мы можам казаць аб паўнавартаснай моднай індустрыі і аб тым, што абсалютная большасць запытаў нашых пакупнікоў самых розных узростаў і пераваг беларуская лёгкая прамысловасць здольная задаволіць.

— І ўсё ж чаго сёння, на ваш погляд, не хапае беларускаму пакупніку пры ўсёй разнастайнасці айчынных калекцый адзення, абутку, аксесуараў?

— На маю думку, увагу сёння варта аддаваць сегменту маладзёжнай моды. Гэта мэтазгодна і з пункту гледжання продажаў — моладзь часцей мяняе гардэроб, чым дарослыя людзі, і з пункту гледжання шырокага поля дзейнасці для дызайнераў нашых прадпрыемстваў. Я б хацела, каб арганізацыі канцэрна больш развіваліся ў гэтым сегменце. Гэта дазволіць прывіць любоў да айчыннага адзення і абутку не толькі сталаму пакупніку, якому ўжо не трэба тлумачыць ні пра якасць, ні пра патрыятызм, але і маладым людзям. Для гэтага нашым прадпрыемствам варта больш сур'ёзна ставіцца да маладзёжнага сегмента моды, тут павінны працаваць яркія, крэатыўныя дызайнеры — у Беларусі такіх шмат. Удзяліць дастаткова сур'ёзную ўвагу гэтаму напрамку — у планах канцэрна на найбліжэйшую перспектыву. І, канешне, вельмі важна прасоўванне нашых калекцый і ў цэлым нашых марак, брэндаў. Слова «брэнд» заходняе, і гістарычна ў заходніх краінах асаблівая ўвага заўсёды ўдзялялася брэндзіраванню і прасоўванню брэнда. Мы да гэтай неабходнасці прыйшлі толькі цяпер. Развіццё брэнда патрабуе і фінансавых укладанняў, і кваліфікацыі спецыялістаў. Любы брэнд трэба вырасціць. Яшчэ адзін важны кірунак работы — мужчынская мода, разнапланавыя калекцыі для мужчын, якіх нашаму пакупніку сёння не хапае. Але тут усё ўпіраецца ў пытанне кадраў. Напрыклад, якасць класічнага мужчынскага касцюма (пінжак і штаны) залежыць у першую чаргу ад чалавечага рэсурсу — ад рук швачкі, яе кампетэнтнасці і прафесіяналізму. Аўтаматызаваць гэтую працу пакуль немагчыма ні ў адной краіне свету. У цэлым, нельга сказаць, што мужчынская палова айчынных спажыўцоў зусім ужо абдзелена нашай увагай. «Камінтэрн» спецыялізуецца на мужчынскіх касцюмах, «Леманграс» адшывае выдатныя калекцыі. Акрамя класікі, ёсць якасны трыкатаж для мужчын ад «Світанка», «Марк Фармэль», «Контэ Спа». Але мы нацэльваем нашы прадпрыемствы на тое, што гэты сегмент трэба не толькі захоўваць, але і пашыраць.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «25 000 дзякуй»

Настоящие правила проведения рекламной игры «25 000 дзякуй» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «25 000 дзякуй» (далее – Рекламная игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ-Евро, СУГ), сопутствующих товаров (кроме табачных изделий, алкогольных и слабоалкогольных напитков, пива) среди прошедших регистрацию обладателей карты-брелока программы «Дзякуй» ОДО «АСТОТРЕЙДИНГ» и стимулирования использования специальной программы для держателей карт Visa, а также в целях повышения объема платежей по картам Visa.

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие определения:

Участник – физическое лицо, отвечающее требованиям, изложенным в п. 7 настоящих Правил, и выполнившее условия участия в Рекламной игре, изложенные в п. 9 настоящих Правил.

АЗС – автозаправочные станции ОДО «АСТОТРЕЙДИНГ», адреса которых указаны в таблице № 1 п. 3 настоящих Правил Рекламной игры.

Игровой продукт – нефтепродукты (АИ-92, АИ-95, ДТ-Евро, СУГ) и сопутствующие товары, реализуемые на АЗС, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра, за исключением табачных изделий, алкогольных напитков, пива и слабоалкогольных напитков.

Шанс – возможность принять участие в розыгрыше Призов согласно таблице № 2 п. 8 настоящих Правил Рекламной игры.

Шанс от Visa Extra – возможность принять участие в розыгрыше Специального Приза от Visa 1, Специального Приза от Visa 2, Специального Приза от Visa 3, Специального Приза от Visa 4 согласно таблице № 2 п. 8 настоящих Правил Рекламной игры.

Карта-брелок – пластиковая карта, прошедшая регистрацию в программе «Дзякуй» до начала или в период проведения Рекламной игры, имеющая уникальный идентификационный номер и которая приобретается на АЗС.

У кнізе шмат фотаздымкаў мемарыяльных помнікаў і дошак, якія прысвечаны абароне горада Магілёва. У ходзе даследавання аўтарка даведалася, што адна з дошак, якая размяшчалася на будынку загса на плошчы Славы, у 1990-я падчас рэканструкцыі пабудовы бясследна знікла. Яна была прысвечана байцам 172-й стралковай дывізіі і народным апалчэнцам. Плошча Славы якраз з'яўлялася адной з крайніх баявых кропак, дзе праходзіла абарона. І Галіна Бяляева лічыць, што гэтая дошка павінна быць адноўлена.

Паскорыць выхад кнігі дапамаглі памочнікі, якіх Галіна Бяляева знаходзіла на кожным кроку. Калі патрэбна была тая ці іншая фатаграфія сучаснага мемарыяла, яна звярталася ў аблсавет грамадскага аб'яднання «Белая Русь», і літаральна праз дзве-тры гадзіны паступала серыя фотаздымкаў. Некаторыя прапанавалі валанцёрскую дапамогу, напрыклад, галоўны інжынер «Магілёўхімвалакно» Канстанцін Сіроцін з жонкай Алай, фотакарэспандэнт «Весніка Магілёва» Улад Жыгадла.

Кніга атрымала адзнаку вядомых магілёўскіх экспертаў па вайне. Яе рэцэнзентамі выступілі ваенны пісьменнік, член рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай Барысенка, дацэнт кафедры дыдактыкі і прыватных методык Магілёўскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Наталля Пурышава.

Выданне прысвечана абароне горада, але інфармацыя, якая тут прадстаўлена, будзе цікавая жыхарам усёй Беларусі, не сумняваецца Галіна Бяляева.

— Я нават адлік часу пачатку вайны вяду не з 4 гадзін раніцы, а з паловы першай ночы, калі ў заходняя ваенныя акругі паступае дырэктыва наркама абароны Сямёна Цімашэнкі, дзе прапаноўваецца не паддавацца на правакацыйныя дзеянні і быць у поўнай баявой гатоўнасці, — аргументуе яна. — Немцы планавалі захапіць тую ж Брэсцкую крэпасць за гадзіну, а яе абарона працягнулася каля месяца. На старонцы за 20 ліпеня я прыводжу фатаграфію фрагмента сцяны Брэсцкай крэпасці, дзе абаронца піша: «Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма». Калі я праводжу ўрокі гісторыі, прашу дзяцей прывесці прыклады іншых краін, дзе б мелі месца вось такія прыклады мужнасці. Дзе б людзі пісалі: не пасаромлю, не здаюся, паміраю, але трымаю абарону да апошняга.

А колькі было нягучных подзвігаў, але вельмі гераічных і важных! 20 і 21 ліпеня 1941-га ідуць у апошні бой міліцыянеры капітана Уладзіміра. Разглабаныя іх супрацівам фашысты забараняюць мясцовым жыхарам хаваць забітых. Але жыхар вёскі Старое Пашкава Іван Глушакоў не паслухаўся і пахаваў міліцыянераў. За гэта фашысты яго расстралялі. Я прыводжу гэтае імя, каб падкрэсліць, што ён таксама герой. Звяртаю ўвагу на нашых пажарных. Пры бамбёжках гарадоў яны першыя выязджалі і тушылі пажары, выцягвалі з-пад завалаў людзей, часта пад абстрэлам нямецкіх самалётаў. Або такі факт. Немцаў вельмі раздражняў чырвоны сцяг на шпілі магілёўскай Ратушы. Яны прыцэльным агнём збівалі яго. Але загадчык інструктарскага аддзела гаркама КПБ Азік Эстэркін падымаўся наверх і зноў яго ўзнімаў. Адважны магіляўчанін загінуў у 1941 годзе пры абароне Магілёва.

— Кожную старонку кнігі я тэсціравала не толькі на дарослых, але і на дзецях, — рэзюмуе аўтар. — Першапачаткова было нават тры варыянты вокладкі выдання. Апошнюю кропку ў выбары паставіў мой 12-гадовы сын Дзмітрый. Вайна ў падлетка асацыюецца з дымным небам і барэльефам з мемарыяльнага комплексу «Буйніцкае поле». Магілёў увайшоў у гісторыю як першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны горад, дзе была здзейснена кругавая абарона. Калі несла рукапіс кнігі на зацвярджэнне старшыні Магілёўскага гарвыканкама Аляксандру Студневу, хвалявалася, але ён адразу ж сказаў: «Гэтая кніга павінна быць!»

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

Прадстаўляючы новае апавяданне лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Алеся БАДАКА «Партрэт», мы хацелі б прыцягнуць увагу чытача «Звязды» да старонак літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя», у прыватнасці, да 11-га нумара часопіса за 2023 год. Акрамя «Партрэта», у раздзеле «Проза і паэзія» гэтага аўтарытэтнага выдання будуць надрукаваны і іншыя, даволі цікавыя творы: пачатак рамана-версіі «Непераможны злом» Віктара ПРАЎДЗІНА, апавяданні Алены БРАВА і Вольгі ЛЮБАШЫНАЙ, вершы Віктара КУНЦЭВІЧА, Таццяны ЯЦУК, Яўгена ГУЧКА і Генрыха ТАРАСЕВІЧА.

А што да «Партрэта», то адзнаку яму чытач «Звязды» дасць ужо сёння, не чакаючы лістападаўскага нумара «Полымя». Прыемнага чытання!

Алесь БАДАК

ПАРТРЭТ

Апавяданне

Яму здавалася, што ён перастаў хваляваца ў той момант, калі дырэктар музея першым узяў слова, і ўжо зусім спакойна адчуваў сябе, нават крыху вальяжна пакалыхваўся ўзад-уперад на насках новых, купленых спецыяльна для гэтага мерапрыемства туфель, калі следам за дырэктарам выступаў намеснік старшыні саюза мастакоў. Перадапошняй, пятай па ліку, да мікрафона падышла немаладая ўжо мастацтвазнаўца і крыху мужчынскім, нейкім не вельмі свежым голасам пачала хваліць яго пейзажы, ледзь не слова ў слова пераказваючы свой нядаўні артыкул у часопісе «Мастацтва». Ён тут жа страціў да яе ўсялякую цікавасць і пры гэтым не пераставаў глядзець, як вяла і бязгучна, быццам у нямым кіно, варушацца яе вусны. Ён захацеў пракруціць у памяці тое, што казалі пра яго іншыя, але аказалася, што яму не так і шмат чаго запомнілася з іх выступленняў, і тады ён зразумеў: хваляванне нікуды не дзелася, яно якраз і стала прычынай яго няўважлівасці.

У маладосці ён лічыўся адным з самых перспектыўных беларускіх пейзажыстаў, але паступова яго засланілі сабой больш прабіўныя равеснікі. Спачатку ён перажываў і суцяшаўся тым, што час усё расставіць па сваіх месцах, аднак жа гэтага чамусьці не здарылася ні калі яму споўнілася сорак, ні калі стукнула пяцьдзясят, і цяпер, перад адкрыццём сваёй выставы, у музеі, дзе на выставах іншых мастакоў ім не раз былі ходжаны-пераходжаны ўсе залы, ён адчуваў сябе чужым, пазбягаў сустракацца позіркам з тымі, хто стаяў насупраць, — у большасці сваёй маладымі людзьмі, напэўна, першакурснікамі альбо старшакласнікамі, — быццам баяўся ўбачыць у іх вачах абыякавасць да ўсяго, што тут адбываецца, ці, яшчэ горш, юначы скепсіс, маўляў, мы добра ведаем цану ветліва-хвалебным тырадам, якія адрасуюцца юбілярам.

Але як толькі дырэктар музея даў слова яму і дакрануўся рукой да яго спіны, здавалася, ужо гатовы нават падштурхнуць яго да мікрафона, ён неяк адразу змяніўся — знешне і ўнутрана: выпрастаўся, у вачах з'явілася ўпэўненасць, а ногі — ён нарэшце перастаў пакалыхвацца — адчулі пад сабой зямную апору, якой ім, аказваецца, да гэтага так не хапала. Ён зрабіў некалькі ўпэўненых крокаў, левай рукой крыху рэзкавата да ўзроўню рота апусціў мікрафон, пасля чаго ўсім целам павярнуўся ў бок роўнай шарэнгі нядаўніх аратараў.

— Самую вялікую асалоду ад малявання я атрымліваў у дзяцінстве, калі яшчэ не ведаў, што такое кампазіцыя і кампазіцыйныя прыёмы. Я пасцігаў гэтую тайну самастойна, паступова, інтуітыўна, і кожнае новае адкрыццё, якое мне бачылася ў нейкай прыдуманай мной дэталі, даводзіла мяне да лёгкага галавакружэння, а гэта і ёсць вышэйшая праява натхнення. Не ведаю, можа, набытыя веды і не ператварылі мяне ў халоднага рамесніка, але сам працэс стварэння карціны, на жаль, даўно перастаў быць тайнай, — ён абхапіў сваю галаву аберуч і далей гаварыў ужо напаўжартам, — а галава перастала кружыцца. Яна нават не закружылася сёння — пасля вашых хвалебных слоў.

Пад яго экспазіцыю адвялі залу часовых выстаў на другім паверсе. Пахадзіўшы туды-сюды, ён доўга выбіраў месца, дзе стаць, каб не быць у цэнтры ўвагі і спакойна назіраць за публікай, адзначаючы для сябе, каля якой карціны яна будзе затрымлівацца даўжэй. Аднак вырашыць да канца праблему з выбарам месца ён так і не паспеў: нечакана ўвесь агляд перад ім закрыла сабой сімпатычная журналістка, ад распушчаных па плячах густых валасоў якой даплываў да яго дзівосны водар дзявочай чысціні.

— Віктар Канстанцінавіч, я магу задаць вам некалькі пытанняў? — спытала яна, пасля чаго, на ўсялякі выпадак, абяззброіла яго сваёй мяккай усмешкай, а ўжо затым назвала сябе і сваё выданне.

Ён кіўнуў, не адрываючы позірку ад яе вачэй.

— Некалькі хвілін назад вы сказалі, што пачалі мляваць яшчэ ў дзяцінстве. А хто аказаў на вас найбольшы ўплыў?

— Ну... у дзяцінстве — сама прырода. Я любіў хадзіць у парк альбо на бераг Свіслачы і доўга глядзець на дрэвы, на ваду. Калі доўга-доўга глядзець на што-небудзь жывое, яно застывае і ператвараецца ў геніяльную карціну.

— Ну а хто апроч прыроды?

— Мой сябар.

— Сябар-мастак?

— Не мастак. Аднакласнік. Проста аднакласнік. У дадзеным выпадку прафесія не мае значэння. Але ён мне аднойчы сказаў: «Калі я гляджу на твае пейзажы, мне хочацца быць дрэвам на іх, а не чалавекам». Збоку гэта падаецца крыху дзіўным кампліментам, праўда? А тады я раптам зразумеў: дрэвы ў нечым падобныя на людзей. Дрэвы, кусты, кветкі. У кожнага свой воблік, свой характар, свая душа. Так, душа. І пасля гэтага я стаў глядзець на прыроду па-іншаму, спрабуючы фарбамі перадаваць яе падабенства з чалавекам.

— Ваш любімы жанр — пейзаж, але вы пішаце і партрэты.

— У асноўным гэта праца на заказ, дзеля заробку. На жаль, пейзажы прадаюцца горш, чым партрэты, адзін з якіх, дарэчы, выстаўлены тут. І калі вы зможаце...

Ён не дагаварыў: нешта адцягнула ўвагу журналісткі, яна перастала яго слухаць і глядзела, як падалося яму, здзіўлена на тое, што было за яго спінай. Ён азірнуўся і разгублена выдыхнуў:

— Вы...

Тры месяцы назад, у сярэдзіне ліпеня, які ў горадзе задушліва пах гарачым ад спёкі асфальтам, Віктар сядзеў у сваёй майстэрні і чакаў, калі пазвоняць у дзверы. Пра мужчыну, які павінен быў пазваніць, ён ведаў толькі, што таму сёлета споўніцца семдзесят, у яго хрыплаваты голас, завуць Сяргей Сяргеевіч, і яму патрэбен уласны партрэт. «У вашым саюзе мне параілі менавіта вас, Віктар Канстанцінавіч», — неяк мнагазначна прагучала ў тэлефоннай трубцы, і ён падумаў, што давядзецца мець справу з кар'ерыстам, для якога ў жыцці вялікае значэнне маюць няпісаныя законы чыноўніцкай субардынацыі.

Віктар уявіў сабе гэтага Сяргея Сяргеевіча: невысокі, з залысінай, пакрытай лёгкім, амаль нябачным пушком, празмерна поўны, гладка, да бляску на шчоках паголены, абавязкова ў касцюме і пры гальштуку. Такому яшчэ паспрабуй дагадзі.

У іншай сітуацыі ён бы адмовіўся ад заказу, але набліжалася яго шасцідзесяцігоддзе, і вельмі патрэбны былі грошы.

У чаканні кліента ён крыху прыбраў у сваёй невялікай — дваццаць квадратных метраў — майстэрні, вызваліў ад кніг старое, на чатырох драўляных ножках і з высокай спінкай, крэсла з паліняла ад часу плюшавай абіўкай, на якое збіраўся пасадзіць госця. Кнігі, два першыя тамы «Гісторыі беларускага мастацтва», паклаў на стол каля шкляной вазы з жывой ружай. Ружу тыдзень назад ён купіў у кветкавым кіёску на ўваходзе ў супермаркет. Было ў ёй нешта незвычайнае, таямніча прыцягальнае. Там, у кіёску, яна яшчэ не да канца распусцілася, да таго самага канца, той самай рысы, пасля чаго пачынаецца паступовае, але незваротнае завяданне.

Ён прынёс ружу ў майстэрню, асцярожна, нібы баючыся параніць, адрэзаў наўскос кончык сцябла і паставіў яе ў вазу з халоднай вадой, затым растварыў у вадзе паўтаблеткі аспірыну, які трымаў тут з сырой і чамусьці вечна насупленай вясны, калі прастудзіў горла. Яму хацелася намаляваць гэтую ружу, але прайшоў дзень, другі, потым тыдзень, за гэты час ён зрабіў некалькі эскізаў з рознай кампазіцыяй і тут жа парваў іх: яны здаваліся невыносна банальнымі.

Нарэшце ў дзверы пазванілі. Сяргей Сяргеевіч аказаўся зусім не такім, якім ён сабе яго ўяўляў. Крыху вышэй сярэдняга росту, сівы, але з такой густой шавялюрай, што яе можна было прыняць за парык. Злёгку прыжмураныя вочы, якія, здавалася, вось-вось былі гатовыя яму падмігнуць, вусны з усмешкай, якой звычайна сустракаюць добра знаёмых: з такімі людзьмі адразу перастаеш адчуваць сябе чужым. Але самым нечаканым было тое, што Сяргей Сяргеевіч прыйшоў не адзін: з ім была жанчына на выгляд гадоў пяцідзесяці, з-за чаго цяжка было зразумець: дачка ці жонка.

— Сяргей Сяргеевіч Максімовіч, — нагадаў сваё імя госць і тут жа дадаў, пяшчотна дакрануўшыся далонню да пляча сваёй спадарожніцы: — А гэта Вольга Іванаўна. Мая Волечка. Я без яе цяпер нікуды ні нагой. Прабачце, што не папярэдзіў.

«Жонка, — падумаў Віктар з лёгкім шкадаваннем: так адзінокія мужчыны, калі бачаць перад сабой чужых прыгожых жанчын, шкадуюць, што тыя дасталіся некаму іншаму, а не ім. — Класічная сямейная сітуацыя: старэючы раўнівы муж хоча запоўніць сабой усю прастору сваёй нашмат маладзейшай жонкі, рэгулярна водзіць яе ў тэатр, на канцэрты, на выстаўкі. Напэўна, яны разам нядаўна, таму ў яго цяпер вельмі адказны перыяд: неабходна як мага часцей дэманстраваць сваёй абранніцы ўсе перавагі яго гадоў у параўнанні з узростам яе равеснікаў: мудрасць, развазлівасць, вялікае кола ўплывовых знаёмых».

— Не чакаў, што буду мець клопат з гэтым. — Сяргей Сяргеевіч паднёс указальны палец спачатку да правага, пасля да левага вока: рагавіца абодвух мела малочна-блакітнае адценне. — Глаўкома, — спакойна прамовіў ён. — Гляджу на свет як у падзорную трубу.

Віктар сумеўся, быццам усё, што ён толькі што думаў, на самай справе сказаў уголас.

— Старэць трэба прыгожа, так, як старэюць дрэвы, правільна?

Віктар ветліва і з разуменнем усміхнуўся ў адказ, паказаў яму, дзе сесці, затым вызваліў ад пустой рамы другое, з аднаго набору, крэсла і паспешліва правёў па ім далонню: гэта была крыху недарэчная рэакцыя на паўпразрыстае святло белага сарафана з рознакаляровымі матылькамі ніжэй калена той, каго не чакаў тут убачыць.

— Дзякуй, — сказала Вольга Іванаўна, і ён заварожана глядзеў, як пры хадзе ад яе рухаў ажывалі на сарафане матылькі. Крэсла, прапанаванае ёй, стаяла каля стала, і, калі яна апусцілася на яго, ён паглядзеў спачатку ёй у вочы, затым перавёў позірк на ружу ў вазе, пасля, ужо крыху збянтэжана, зноў паглядзеў ёй у вочы і накіраваўся да мальберта.

— Гэта Волеччына жаданне: заказаць партрэт да майго сямідзесяцігоддзя, — не без гонару прызнаўся Сяргей Сяргеевіч. — Я спачатку заўпарціўся, потым прапанаваў сямейны партрэт — удвух з Волечкай, але ўрэшце мы вырашылі, што сямейны закажам праз год — да юбілею нашай сям'і.

Віктар ускінуў бровы: «Юбілей? Гэта колькі — пяць, дзесяць?»

— Дзесяць гадоў разам, — задаволіў яго цікавасць Сяргей Сяргеевіч і некалькі імгненняў моўчкі сачыў за тым, як ён рэзка водзіць алоўкам па ватмане, прымацаваным кнопкамі да мальберта. — А вы ўжо што — пачалі пісаць партрэт? — і паправіў вузел цёмна-шэрага (у тон піджака), з аранжавымі палоскамі наўскос гальштука.

— Ну, як вам сказаць: пакуль я толькі раблю эскізы.

— Сяргей, — мякка сказала Вольга Іванаўна, — мне здаецца, сваімі размовамі ты перашкаджаеш чалавеку працаваць.

— Не хвалюйцеся, — супакоіў яе Віктар, — размова дапамагае лепш распазнаць твар, асаблівасці мімікі.

Сяргей Сяргеевіч крыху памаўчаў, быццам вырашаючы, да чых слоў яму варта прыслухацца — да жончыных ці да слоў чалавека, якога ён амаль не ведаў.

— Некаторая празмерная гаварлівасць — гэта, можна сказаць, прафесійная хвароба,—

растлумачыў ён. — Лекцыі, лекцыі, лекцыі... Усё жыццё аддаў універсітэту — студэнт, выкладчык, загадчык кафедры, дэкан. Не Бог ведае якіх вяршынь дасягнуў, затое, здаецца, і чужых крэслаў ніколі не займаў.

Гадзіны праз дзве Віктар сказаў, што на сёння ўсё.

— А можна паглядзець, што ў вас атрымалася? — далікатна папрасіла Вольга Іванаўна?

— Прабачце, я стараюся нікому не паказваць свае работы, пакуль іх не закончу.

— Гэта звязана з нейкай прыкметай?

— Калі мастацтва перастае быць таямніцай, яно перастае быць мастацтвам, — усміхнуўся Віктар, правёў гасцей да ліфта і з лёгкім шкадаваннем глядзеў, як разам з імі ў кабіну залятаюць рознакаляровыя матылькі.

У наступны раз яна была ў аднатонным, светла-блакітным касцюме, але нават не пераступіла парог, толькі спытала, колькі часу ў яе на пакупкі.

— Жанчына ёсць жанчына, — задаволена выдыхнуў Сяргей Сяргеевіч, калі яны засталіся ўдвух. — Кажа, тут побач харошы гандлёвы цэнтр. А ведаеце, — разгаварыўся ён, — Волечка была маёй студэнткай. Адной з найлепшых студэнтак. Разумніца і прыгажуня. Ёй сямнаццаць, мне трыццаць шэсць, уяўляеце — трыццаць шэсць! Мы вучыліся разам з яе бацькам. Ён, праўда, на тры курсы вышэй, але гэта не замінала нашаму сяброўству. Абодва закончылі аспірантуру пры ўніверсітэце, абодва засталіся ў ім працаваць. І тут з'явілася Волечка...

Сяргей Сяргеевіч на хвіліну задумаўся. У майстэрні пахла свежымі фарбамі. Праз расчыненую фортку шум машын на праспекце нагадваў шум марскога прыбою.

— У мяне тады яшчэ была сям'я. Ды і Волечка на чацвёртым курсе выскачыла замуж. Закончыла ўніверсітэт і надоўга прапала. А потым памерла яе маці. Для майго сябра гэта стала вельмі цяжкім ударам: што вы, у іх было такое каханне... У выніку — інсульт, Волечка закінула працу... Ну, яна неяк там дапамагала мужу займацца бізнесам, і амаль дзевяць гадоў фактычна пражыла ў бацькавай кватэры. Муж — што муж: угаворы наняць сядзелку, скандалы, развод. Можна сказаць, пакінуў яе ні з чым. Праўда, і ў самога на той час бізнес пачаў развальвацца. Ну, а калі бацька яе памёр, я прапанаваў ёй працу ў факультэцкай бібліятэцы. Яна шмат нацярпелася ў жыцці, Віктар Канстанцінавіч, паспрабуйце паглядзець на нашы з ёй адносіны з гэтага ракурсу.

«Глядзець на чужое жыццё — усё роўна што глядзець на месяц на небе: кожны раз убачыш толькі палову», — падумаў Віктар. Адкуль ён ведае, шчаслівая яна цяпер ці не? І пасля таго, як Сяргей Сяргеевіч раскрыўся яму, на гэтае пытанне стала яшчэ складаней знайсці адказ. Шчасце — калі ёсць грошы? Калі спакойнае жыццё і муж дзеля цябе гатовы на ўсё? Відаць, так. Але гэта і ёсць толькі тая самая бачная палова.

Мінулы раз, калі яна сядзела на крэсле каля стала, ён раптам заўважыў, як яны падобныя — ружа, якая перад сваім завяданнем, уражваючы апошняй, спелай прыгажосцю, здавалася, у нейкім гарачым напружанні ледзьве стрымлівала свае пялёсткі, што вось-вось гатовы былі выбухнуць і разляцецца, і жанчына, прыгажосць якой у гэтым узросце праз усю плоць, праз кожную клетачку дыхала жарам, што чакаў выпадковага ветру, каб ярка ўспыхнуць перад яе паступовым згасаннем. Ці была яна шчаслівая гэтай сваёй нябачнай яму паловай?

Сяргей Сяргеевіч і Вольга Іванаўна яшчэ тры ці чатыры разы наведалі яго майстэрню, пакуль ён нарэшце не сказаў:

— Ну, што ж, дні праз два можаце прыйсці, каб паглядзець на гатовы партрэт.

Яны ўжо былі на на лесвічнай пляцоўцы, як Вольга Іванаўна раптам спахапілася:

— Прабачце, я забыла ў вас сваю сумачку!

— О, у сумачцы сучаснай жанчыны больш каштоўнага, чым у Каралеўскай скарбніцы лонданскага Таўэра, — пажартаваў Сяргей Сяргеевіч.

Вольгі Іванаўны, здавалася, не было некалькі хвілін.

— Жанчыны не любяць спяшацца, у якой бы сітуацыі мужчыны іх не чакалі, — зноў пажартаваў Сяргей Сяргеевіч.

Віктар адчуў, як на твар яго гарачай хваляй набягае чырвань, і амаль подбегам паспяшаўся ў майстэрню.

Вольга Іванаўна спалохана і ў страшным недаўменні стаяла каля мальберта, на які быў устаноўлены падрамнік, абцягнуты халстом. З халста на Вольгу Іванаўну глядзела жанчына ў поўны рост, у якой няцяжка было пазнаць яе самую. На жанчыне быў неверагодна празрысты белы сарафан з рознакаляровымі матылькамі ніжэй калена — усё, што мастак палічыў мэтазгодным надзець на яе.

— Як вы маглі! — з адчаем у голасе ўсклікнула Вольга Іванаўна і, з сілай адштурхнуўшы Віктара, які стаяў у яе на дарозе, выскачыла з майстэрні.

Яна з мужам не прыйшлі сюды ні праз два дні, ні праз тыдзень.

Маладая журналістка назірала, як два чалавекі — незнаёмая жанчына гадоў пяцідзесяці і мастак, якому яна не паспела задаць яшчэ некалькі пытанняў, — доўга моўчкі глядзяць адно аднаму ў вочы, і не ведала, як сябе паводзіць.

— Я думала, што тут будзе вісець той варыянт майго партрэта, які бачыла ў вашай майстэрні, — першай парушыла маўчанне жанчына, у голасе якой адчувалася напружанасць.

— Цяпер вы ведаеце, чаму я стараюся нікому не паказваць свае работы, пакуль іх не закончу.

— Але, наколькі я памятаю, вы збіраліся пісаць партрэт майго мужа.

— Так і ёсць, Вольга Іванаўна. Партрэт даўно гатовы і чакае ў майстэрні.

— Як? — здзівілася жанчына.

— Ну, каб напісаць мужчынскі патрэт на заказ, часцей за ўсё дастаткова двух-трох сеансаў.

— Спадзяюся, вы не намаляавалі майго мужа ў выглядзе якога-небудзь дрэва? — прыкметна павесялела яна.

— Не, але гэта цудоўная ідэя, тым больш што, як бачыце, я люблю рабіць варыянты.

Яны абое нечакана гучна засмяяліся, тым самым як бы прабачаючы адно аднаго за тое, што месяц назад здарылася паміж імі ў майстэрні.

Маладая журналістка ў задуменні накіравалася праз усю залу да карціны, якую бачыла хвілін дваццаць назад. Цяпер да яе было цяжка падступіцца. На карціне стаяла ў поўны рост жанчына, і на яе з усіх бакоў зляталіся рознакаляровыя матылькі, і ўся яна была ў матыльках, якія дакладна паўтаралі контуры яе стройнай фігуры. Ногі жанчыны ўнізе пераходзілі ў адну тонкую лінію, а валасы ўтваралі сабой пышную чырвоную ружу з раскрытымі, нібы вось-вось гатовымі вырвацца ў неба пялёсткамі.

З архіўных крыніц

КІНЕМАТОГРАФ ПАТРАБУЕ НОВЫХ КАДРАЎ! ГОД 1953...

«Загадчыку аддзела мастацкай літаратуры і мастацтва ЦК КП Беларусі тав. Буславу К. П.
Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР дасылае Вам план мерапрыемстваў ССП БССР па паляпшэнню работы ў галіне кінадраматургіі, распрацаваныя намі ў сувязі з даручэннем бюро ЦК КПБ.
Сакратар Праўлення ССП БССР Пав. <...> Кавалёў».
Перш чым звярнуцца да самога зместу «плана мерапрыемстваў», які разам з суправаджальнай запіскай пісьменніка і літаратурнага чыноўніка са стажам Паўла Нічыпаравіча Кавалёва захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, звернем увагу на дату, якой пазначаны дакумент, — 5 сакавіка 1953 года... Менавіта ў гэты дзень з Саюза Савецкіх Пісьменнікаў БССР «выправіўся» дакумент у высокую партыйную інстанцыю. Важная папера паступіла ў ЦК партыі 6 сакавіка. Загадчык аддзела мастацкай літаратуры размашыстым почыркам пазначыў: «В дело». Збоку ёсць яшчэ адна храналагічная пазнака: «7. III. 53 г.». Відаць, гэта ўжо часавыя гісторыю важнай паперы прадоўжыў справаводца, перадаючы ліст з пісьменніцкай арганізацыі ў «цянёты архіваў». Ніякай жа рэзалюцыі на плане мерапрыемстваў альбо на суправаджальным лісце Паўла Кавалёва няма... Даручэнне бюро ЦК КПБ пісьменнікі выканалі, склаўшы план мерапрыемстваў, — і дастаткова!..

Фільм па п'есе Крапівы «Хто смяецца апошнім» быў зняты ў далёкім 1954-м.

5 сакавіка 1953 г., вечарам, на 75-м годзе жыцця памёр кіраўнік Савецкай дзяржавы — Старшыня Савета Міністраў СССР і на той час Сакратар ЦК КПСС (Генеральным сакратаром ён перастаў быць яшчэ ў 1934-м; хоць, зразумела, і кіраўніцтва Камуністычнай партыяй было на ім як на першай асобе) Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Яго знайшлі ў ноч з 1 на 2 сакавіка ахоўнікі ў малой сталовай на Бліжняй дачы ў Кунцава. Правадыр, які наводзіў страх і выклікаў захапленне мільёнаў людзей вялікай Савецкай краіны, ляжаў у бездапаможным стане... Толькі 4 сакавіка было абвешчана пра хваробу Сталіна, былі надрукаваны і перадаваліся па радыё бюлетэні пра стан яго здароўя. Згадваліся прыкметы цяжкага стану: інсульт, страта свядомасці, параліч цела, агональнае дыханне. У той самы дзень было склікана экстраннае пасяджэнне Бюро Прэзідыума ЦК КПСС. На пасяджэнні была спынена дзейнасць Бюро. Яго злілі з Прэзідыумам ЦК. Рэфармацыі ажыццявілі і ў дачыненні да ўрада СССР. Урад узначаліў Георгій Малянкоў... Словам, ішла дзяльба ўлады... Пра смерць Сталіна абвясцілі па радыё 6 сакавіка ў 6 гадзін раніцы. 6—9 сакавіка савецкі народ развітваўся са Сталіным. Па ўсёй краіне была абвешчана жалоба. Пахаванне прайшло 9 сакавіка... Якімі клопатамі жылі ў той час у рэспубліканскім ЦК — можна толькі здагадвацца. І, тым не менш, жыццё ішло, прадаўжалася. Мо і дакумент, прынесены Буслаеву, ужо не ўяўляў ранейшай цікавасці?..

Кароткае адступленне. Павел Нічыпаравіч Кавалёў (1912—1995), які падпісаў справаздачу ў ЦК, — празаік, драматург, перакладчык. Член Саюза пісьменнікаў — з 1945 года. З 1943 да 1944 гг. служыў старшым памочнікам начальніка аддзялення друку ў Цэнтральным штабе партызанскага руху. Пасля расфарміравання штаба быў памочнікам спачатку трэцяга сакратара ЦК КП(б)Б, затым — першага сакратара ЦК КП(б)Б. З 1946 г. — адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў. У 1967—1972 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Аўтар некалькіх кніг прозы («Прага б'ю», «Падзенне Хвядоса Струка», «Дзень першы, ноч апошняя», Пакінь нас, трывога»), некалькіх п'ес («Подзвіг», «Рабочая кроў» і інш.). Пісаў і творы для дзяцей.

Казімір Паўлавіч Буслаў (1914—1983) — беларускі савецкі філосаф. У 1947 годзе скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП (б). У 1944—1948 гг. — лектар ЦК КП(б)Б. У 1951 годзе Буслаў закончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У 1951—1956 гг. — загадчык аддзела мастацкай літаратуры ЦК КПБ. У 1956 годзе прызначаны дырэктарам Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР. Зрабіў паспяховую кар'еру ў навуцы. Абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыю па філасофіі. Быў абраны: спярша — членам-карэспандэнтам АН БССР, затым — правадзейным акадэмікам АН БССР (1972). Апублікаваў болей за 60 навуковых прац, сярод іх — чатыры манаграфіі. Характэрнай з'яўляецца назва адной з іх: «Сацыяльнае адзінства, супярэчанні, адказнасць». Адна з апошніх кніг партыйнага філосафа — манаграфія «Фарміраванне сацыяльнага ў чалавеку», якая была выдадзена ў Мінску ў 1980 годзе.

Што ж за мерапрыемствы планавалі ажыццявіць у Саюзе пісьменнікаў у 1953 годзе як найхутчэй?.. План, зацверджаны Прэзідыумам ССП БССР яшчэ 25 лютага 1953 г., называецца наступным чынам: «Мерапрыемствы Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР па паляпшэнню работы ў галіне кінадраматургіі». А мерапрыемствы наступныя: *«1. Для актывізацыі і павышэння тэарэтычных ведаў маладых сцэнарыстаў арганізаваць у маі месяцы г.г. дзесяцідзённы семінар па кінадраматургіі. Для чыткі лекцый, правядзення творчых гутарак па пытаннях кіно і кіраўніцтва практычнымі заняткамі на семінары прасіць праўленне ССП СССР накіраваць у Мінск трох лепшых кінасцэнарыстаў, а Міністэрства Кінематаграфіі БССР — вылучыць для гэтай жа мэты групу кінарэжысёраў.*

2. Пісьменнікам, якія зрабілі творчыя заяўкі на напісанне сцэнарыяў і маюць патрэбу ў паездках для збору матэрыялаў, выдаць творчыя камандзіроўкі са сродкаў ССПБ.

3. Звярнуцца з пісьмом у абласныя аддзяленні ССП з мэтай выяўлення і прыцягнення ў кіно новых кадраў маладых кінадраматургаў з перыферыі.

4. Абавязаць секцыю драматургіі і кіно абавязкова абмяркоўваць усе лібрэта і сцэнарыі беларускіх пісьменнікаў да здачы іх у кінастудыю.

5. Узяць пад непасрэдны нагляд і творчую дапамогу работу пісьменнікаў М. Паслядовіча, І. Шамякіна, А. Маўзона, А. Макаёнка. К. Губарэвіча, В. Вольскага, М. Блісцінава, якія працуюць над новымі сцэнарыямі.

6. Паставіць перад кіраўніцтвам кінастудыі «Беларусьфільм» пытанне аб абавязковым прымацаванні к пісьменнікам, якія пішуць сцэнарыі, у якасці кансультантаў вопытных кінарэжысёраў.

7. Для папулярнасці кінематаграфічных твораў прасіць Белзяржвыдавецтва выдаць асобным зборнікам сцэнарыі беларускіх пісьменнікаў («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «Советская Беларусь» К. Губарэвіча, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Рассвет» М. Паслядовіча і «Белая вежа» М. Блісцінава)».

Які ж плён адбыўся ў выніку? Што было здзейснена ў беларускім кінематографе ў 1953-м і ў наступныя гады?.. Да гледача прыйшла карціна «Пяюць жаваранкі» (яшчэ ў 1950 годзе Кандрат Крапіва апублікаваў аднайменную п'есу; рэжысёрамі фільма выступілі Уладзімір Корш-Саблін і Канстанцін Саннікаў), а яшчэ — кінафільмы «Дзесі партызана», «Хто смяецца апошнім», «Беларускі канцэрт», «Зялёныя агні», «Несцерка», «Міколка-паравоз»... У 1958 годзе на экраны выйшаў неблагі фільм «Чырвонае лісце» па сцэнарыі Аркадзя Куляшова і Алеся Кучара. Дарэчы, Кучар напісаў (у суаўтарстве з М. Фігуроўскім) таксама і сцэнарый «Гадзіннік спыніўся апоўначы». І «Міколка-паравоз», і «Чырвонае лісце», і «Гадзіннік спыніўся апоўначы» некалькі дзесяцігоддзяў не сыходзілі з экранаў кінатэатраў, шмат разоў былі паказаны па тэлебачанні. І ўсё ж масавага ўдзелу пісьменнікаў у беларускім кінапрацэсе не атрымалася. Прычыны на тое самыя розныя. І не толькі пісьменніцкая супольнасць вінаватая ў тым, што кінашэдэўраў усё ж не з'явілася...

Кастусь ЛЕШНІЦА,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

ДУХОЎНЫ КОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

У Шчучыне адбылося ўрачыстае завяршэнне ўнікальнага праекта, прысвечанага старажытным сядзібам Беларусі. Апошнім томам выдання стала кніга з апісаннем славутасцяў двух раёнаў Гродзеншчыны — Смаргонскага і Шчучынскага. Аўтар усяго цыкла — знакаміты краязнаўца, доктар біялагічных навук, даследчык Анатоль Федарук. На жаль, летась яго не стала. Ён пайшоў з жыцця ва ўзросце 83 гадоў. Але матэрыял, які сабраў, працягвае выходзіць з друку. У Выдавецкім доме «Звязда» ўбачылі свет два тамы яго праекта. Прэзентацыя апошняга тома прайшла ў былым палацы Друцкіх-Любецкіх, гісторыя якога таксама ўвайшла ў кнігу. Палац — адзін з нямногіх старажытных аб'ектаў, які поўнасцю адноўлены і даступны для наведвальнікаў.

Палац можна назваць візітнай карткай Шчучынскана раёна. Ён пабудаваны напрыканцы XIX стагоддзя. Доўгі час будынак быў безгаспадарчым, але дзесяць гадоў таму тут пачалася рэканструкцыя за кошт бюджэту. За два гады палац зноў набыў велічны выгляд, і цяпер тут размешчаны цэнтр дзіцячай творчасці. Таму лагічна, што прэзентацыя кнігі аб мясцовых сядзібах праходзіла менавіта ў такім знакавым месцы. Унікальнай можна лічыць і асобу аўтара.

— Доктар біялагічных навук, даследчык старажытных сядзіб Анатоль Тарасавіч Федарук на працягу многіх дзесяцігоддзяў самастойна абышоў усе тыя адрасы, пра якія расказаў у сваім праекце. Ён падарожнічаў з фотаапаратам, з нататнікам, фіксаваў усё, што можна было знайсці не толькі на месцах існуючых замкаў, палацаў, але і там, дзе ад былой велічы засталіся толькі расліны. Ён такім чынам рэканструяваў у свядомасці сваіх чытачоў гэтыя мясціны, што кожны мог уявіць, якое жыццё там адбывалася, якія прывозілі расліны, якія стваралі гербарыі, якія былі калекцыі жывапісу, мастацтва, кніжныя і архіўныя рукапісныя зборнікі. Ён вельмі шмат працаваў з замежнымі архівамі, быў дасведчаны ў частцы крыніцазнаўства па гісторыі сядзіб, — паведаміў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

Як аказалася, літаратурная спадчына Анатоля Федарука даволі багатая. Адна з першых яго кніг — «Садова-паркавае мастацтва Беларусі» — выйшла яшчэ напрыканцы 80-х гадоў. З тае пары ён актыўна выдаваў выніку свайго даследавання і працягваў падарожнічаць па Беларусі.

— У выдавецтве «Звязда» выйшлі дзве яго кнігі, прысвечаныя старажытным сядзібам Гродзеншчыны. Апошні том прысвечаны Смаргонскаму і Шчучынскаму раёнам. Я спадзяюся, што мы і надалей будзем выдаваць спадчыну Федарука, безумоўна, у яго рэдакцыі, але з сённяшнімі звесткамі пра тыя ці іншыя мясціны, — зазначыў Алесь Карлюкевіч.

Найбольш цеснае супрацоўніцтва аўтара адбылося з **навуковым рэдактарам праекта, дацэнтам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Вольгай ПАПКО.** Яна займалася праверкай дат, імёнаў, падзей, назваў маёнткаў, шукала старажытныя здымкі.

За 10 гадоў сумеснай работы адрэдагавана каля паўтары тысячы старонак самага грунтоўнага твора Анатоля Федарука аб сядзібах Беларусі. Ён апісаў Мінскую, Брэсцкую і Гродзенскую вобласці. І калі на першыя два рэгіёны прыйшлося па адным томе, то на Гродзенскі — ажно пяць. Аказалася, што тут больш за ўсё старажытных сядзіб і паркаў. Дарэчы, менавіта з раслін і пачаліся даследаванні Федарука.

— Анатоль Тарасавіч у 80-я гады працаваў намеснікам дырэктара батанічнага саду Акадэміі навук, а ў той час навукоўцы ездзілі па рэгіёнах, даследавалі экзатычныя расліны на старажытных сядзібах. У рамках гэтай работы ў яго з'явілася цікавасць да саміх сядзіб, ён рабіў здымкі. Таму ў яго кнігах мы бачым, што адбывалася на тых сядзібах на працягу гісторыі і што ёсць цяпер. На жаль, многія страчаны. Некаторыя адноўлены і пачалі працаваць як музеі, некаторыя выкарыстоўваюцца як бальніцы, школы, у некаторых нават жывуць людзі.

На думку Вольгі Папко, сядзібныя даследаванні маюць і практычнае значэнне. Працягваецца вывучэнне раслін паркавай тэрыторыі. Паколькі ўладальнікі сядзіб высаджвалі тут экзатычныя расліны, знаходзяцца аматары, якія ездзяць туды і збіраюць насенне. Правільная работа ў гэтым кірунку магла б узбагаціць нашы беларускія ландшафты і паркавыя зоны, лічыць навукоўца.

Таксама гэтыя выданні можна скарыстаць пры складанні гістарычнай даведкі пра тую ці іншую сядзібу. Гэта патрэбна пры набыцці такіх аб'ектаў у арэнду або ўласнасць. У свой час аўтар кніг кансультаваў уладальнікаў сядзіб, дапамагаў у рэстаўрацыі і быў спецыялістам, якога ведалі па ўсёй краіне.

На жаль, пераважная большасць славутых маёнткаў страчана альбо разбураецца. У двух раёнах з больш чым 40 апісаных аб'ектаў дзейнічае толькі 5-6 старажытных сядзіб, самыя значныя з якіх — гэта Шчучынскі палац Друцкіх-Любецкіх і музей-сядзіба Агінскага ў Залессі. Мясцовыя ўлады шукаюць шляхі іх захавання. Напрыклад, сёння вырашаецца пытанне па палацы Чацвярцінскіх у гарадскім пасёлку Жалудок. Велічны двухпавярховы будынак з мансардай размешчаны ў цэнтры старога парку. Калісьці яго набыў расіянін, але ўмовы па аднаўленні не выканаў, таму ёсць судовае рашэнне па вяртанні палаца ў дзяржаўную маёмасць. Пры вырашэнні ўсіх пытанняў з аб'ектам будзе працягвацца работа надалей.

— Мы будзем працаваць з гэтым палацам, будзем шукаць магчымасць зберагчы такія аб'екты. У гэтым сэнсе кніга «Сядзібы Гродзеншчыны», у прыватнасці з апісаннем Шчучынскага раёна, даволі грунтоўная, — лічыць **старшыня Шчучынскага райсавета Ганна ХВЯДЗЮК.** — Вось у нас у Вялікім Мажэйкаве знаходзяцца элементы сядзібы Гурнофель, Дэмбрава — таксама толькі рэшткі... І нам важна захаваць гэта. Тое, што ёсць, зносіць не плануем. Ёсць пагроза знішчэння натуральным шляхам, многія менавіта такім чынам разбураюцца. Канешне, хочам захаваць усё.

А між тым, на тэрыторыі таго ж Шчучынскага раёна нямала славутых мясцін. Напрыклад, у вёсцы Новы Двор быў маёнтак вядомай беларускай паэтэсы і пісьменніцы Элаізы Пашкевіч, якая друкавалася пад псеўданімам Цётка і выдала першы беларускі буквар для дзетак. Яна пахавана ў сваёй вёсцы, мясцовая школа носіць імя паэтэсы, а вось сядзіба не захавалася. Па словах **намесніка аддзела адукацыі Шчучынскага райвыканкама Жанны МЯЦЬКО,** у кнізе Анатоля Федарука шмат інфармацыі аб сядзібе Пашкевічаў, аб якой у Шчучыне нават не ведалі. Такім чынам, кніга дапаможа пры падрыхтоўцы да навукова-практычных канферэнцый, якія звязаны з даследаваннем старажытных сядзіб. Таксама выданне стане цікавым і ў асабістым плане як напамін аб малой радзіме, яе гістарычным мінулым. «Школьнікі будуць чытаць кнігу і, магчыма, больш беражліва ставіцца да таго, што мы маем. Праз гістарычную памяць абуджаецца любоў да роднага краю», — упэўнена Жанна Мяцько.

Аб гэтым сведчыць і выстаўка дзіцячых малюнкаў і макетаў, якія былі прадстаўлены падчас прэзентацыі. Работы адлюстроўваюць славутасці Шчучына і Гродзенскай вобласці. Як расказала **настаўнік Дзіцячай школы мастацтва Святлана БЯРОЗКІНА,** дзецям такія аб'екты вельмі цікавыя, бо паралельна з малюнкам адбываецца знаёмства з гісторыяй мясцовасці і будынка. Гэта заўсёды прыцягвае ўвагу дзяцей, многія ганарацца ўнікальнымі аб'ектамі, імкнуцца з дапамогай розных тэхнік прадэманстраваць сваё бачанне гістарычных месцаў.

Магчыма, будучае пакаленне не застанецца ўбаку ад лёсу тых маёнткаў, якія дзе-нідзе яшчэ сустракаюцца ў рэгіёнах краіны. Бо захаваць памяць, безумоўна, важна, але яшчэ важней захаваць і пры магчымасці аднавіць хаця б рэшткі гэтых сядзіб. Мы бачым, якая значная работа вядзецца адносна аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, як аднаўліся старажытныя замкі, крэпасці, палацы. Магчыма, чарга дойдзе і да былых сядзіб, якія таксама могуць стаць вядомымі турыстычнымі і сацыяльнымі аб'ектамі. У гэтым сэнсе даволі слушныя разважанні выказаў **начальнік аддзела адукацыі Шчучынскага райвыканкама Павел ТАРЧЫНСКІ.** Ён нагадаў, што многія аб'екты, якія апісаны ў кнізе Анатоля Федарука, былі драўлянымі, а праз гэтыя мясціны прайшлі дзве сусветныя вайны, ды і цэгла таксама разбураецца. Часам ад былога застаецца толькі малюнак, здымак альбо кніга.

— Пакуль ідзе гаворка аб тым, каб аднавіць гэтыя сядзібы як культурны і духоўны код, — лічыць суразмоўнік. — Мне складана сказаць, ці можам мы аднавіць кожную сядзібу за пэўны час, гэта складана і з фінансавага пункту гледжання. Асабліва ў рамках бюджэту раёна. Але можна пафантазіраваць, што такая магчымасць з'явіцца, будуць нейкія спонсары, дастаткоўвыя сродкі. А што аднаўляць, калі толькі падмурак? І тут мы адкрываем кнігу, бачым выяву гэтай сядзібы па старых здымках ці малюнках, яе апісанне. Бачым, як парк выглядаў, гаспадарчыя пабудовы — нам ёсць адкуль стартаваць.

Ці гэта код наш генетычны, ці вабнасць мінулага, але патрэба ва ўсведамленні гістарычнай спадчыны не згасае, у тым ліку з боку новых пакаленняў. Наадварот, па словах **дырэктара турыстычнага інфармацыйнага цэнтра Кацярыны БОДАК,** запыт на гістарычныя маршруты толькі расце. Іх у Шчучыне некалькі, у склад уваходзіць каля 30 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Найбольшай папулярнасцю карыстаецца палац Друцкіх-Любецкіх, які таксама некалі стаяў і разбураўся. А цяпер тут, лічы, турыстычная Мекка, будынак жыве і радуе дзяцей і дарослых.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ПАДАРОЖЖА

У Паўночным завулку Мінска

У Мінску таксама ёсць месцы, дзе жыве так званы genius loci, дух горада — і адно з такіх месцаў, безумоўна, Паўночны завулак, які знаходзіцца каля плошчы Францішка Багушэвіча, непадалёк ад гістарычнага прадмесця «Грушаўка». Каб трапіць сюды, трэба падняцца ад станцыі метро па высокай лесвіцы — і гэта таксама стварае адчуванне асаблівай атмасферы, адгароджанай ад сучаснага горада. Бо тут захавалася ўнікальная драўляная забудова пачатку XX стагоддзя, унесеная ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Жылі тут напачатку супрацоўнікі чыгункі — для іх і быў створаны завулак, у 1920-х сялліся маладыя паэты і пісьменнікі... Сёння тут многае змянілася — нешта знікла, нешта перабудавана... Але гістарычнае аблічча засталося. І вось на Дзень горада для мінчан быў зроблены выдатны падарунак — у Паўночным завулку адкрыўся новы музей, экспазіцыя якога распавядае пра гісторыю Паўночнага завулка і Грушаўскага прадмесця.

Экспазіцыя размясцілася ў трох драўляных будынках — яны былі перанесены на новае месца з-за будаўніцтва метро і перададзены Мемарыяльнаму музею-майстэрні Заіра Азгура, філіялам якога і з'яўляецца новы музей. Экспанаты падрыхтаваны сумеснымі намаганнямі музея-майстэрні Заіра Азгура, Музея гісторыі горада Мінска і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

У першым з дамоў размясцілі экспазіцыю «Сілуэты старога Мінска: Паўночны завулак і Грушаўскае прадмесце». Там можна ўбачыць

Нам засталася спадчына

КРЫЖ НА ГРУШЫ, КРЫЖ НА КАМЕНІ

Цікавосткі беларускіх храмаў

Давайце цяпер адправімся ў невялікае паломніцтва па Гродзенскай і Брэсцкай абласцях разам са «Звяздой» і Нацыянальным агенцтвам па турызме. Паглядзім на незвычайны храм-крэпасць, памолімся каля цудатворнага вобраза Жыровіцкай Божай Маці і паслухаем дзіўныя гісторыі пра мясцовыя святыні ад настаяцеля вясковага храма.

Малітва і абарона

Першы пункт — адзін з самых незвычайных храмаў Беларусі, царква Святога Архістратыга Міхаіла ў Сынкавічах Гродзенскай вобласці. Што ж у ёй такога ўнікальнага? А тое, што гэты храм больш нагадвае крэпасць, чым стандартную праваслаўную царкву. Яго архітэктура не мае аналагаў у свеце, ёсць толькі падобныя ў Польшчы і Шчучынскім раёне.

Існуе легенда, што пабудавана царква па загадзе вялікага князя літоўскага Вітаўта ажно ў XV стагоддзі. Памятаеце тую вядомую гісторыю, як Вітаўт быў зняволены сваім стрыечным братам Ягайлам у Крэўскім замку і як збег адтуль, пераапрануўшыся ў жаночую сукенку? Дык вось нейкі час ён хаваўся ў той самай мясцовасці, дзе цяпер стаіць дзівосны храм. Тады на яго месцы была толькі невялікая крэпасць, акружаная з двух бакоў рэчышчамі мясцовай рачулкі Бярозы. Пасля таго як Вітаўт узышоў на вялікакняжацкі пасад, ён загадаў перабудаваць тую крэпасць у праваслаўны храм, у якім змяшаліся ранняя готыка і старажытная Візантыя.

Цікава тое, што назва вёскі таксама звязана з будаўніцтвам храма. Легенда гаворыць, што некалі тут адбылася трагедыя. Царкву будавалі бацька з сынам. Раптам сын сарваўся з лясоў і разбіўся насмерць. Бацька быў у роспачы і крычаў: «Сынку мой, сынку!» Неўзабаве вакол царквы з'явілася вёска, якую так і назвалі, — Сынкавічы.

Храм перажыў шмат гістарычных падзей. Ён быў і праваслаўным, і ўніяцкім, і каталіцкім, а ў савецкі час нават служыў сховішчам для агародніны.

У 1993 годзе царква вярнулася праваслаўным. На жаль, у вёсцы Сынкавічы няшмат людзей, таму храм не мае ўласнага прыходу, але, тым не менш, богаслужэнні тут здзяйсняюцца рэгулярна па суботах, нядзелях і святочных днях, бо прыезджых паломнікаў тут хапае. Да таго ж у царкве знаходзіцца свая святыня: абраз Божай Маці «Усецарыца». У гонар яе асвечана святая крыніца, якая размешчана зусім непадалёк ад храма, там жа ёсць гасцініца для паломнікаў.

Цэнтр беларускага праваслаўя

Наступны пункт у нашай вандроўцы — Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр. Гісторыя гэтага духоўнага цэнтра Беларусі пачалася ў 1470 годзе са знаходжання іконы Божай Маці. Выява была нерукатворнай, і знайшлі яе пастухі сярод галін дзікай грушы. Незвычайная ікона Багародзіцы з немаўлём прыцягнула іх сваім ззяннем, яны прынялі гэта за цуд і паспяшаліся аднесці знаходку свайму гаспадару, скарбніку ВКЛ Аляксандру Солтану. Аднак памешчык не адрозніваўся набожнасцю і схаваў ікону ў куфэрак. Увечары ён хацеў паказаць цуд гасцям, але, на здзіўленне, выявіў, што ікона знікла. Знойдзена яна была на другі дзень на той жа грушы. Гэтым разам Солтан зразумеў вартасць святыні і паабяцаў пабудаваць у Жыровічах на гэтым месцы храм у гонар Прасвятой Багародзіцы. Сваё слова стрымаў: хутка тут з'явіўся драўляны храм.

На жаль, гісторыя яго была зусім нядоўгай. У 1520 годзе ў Жыровічах здарыўся пажар. Храм згарэў, а нерукатворны вобраз быў страчаны. Ад ранейшых пабудоў засталася толькі царкоўная школа. Гэта і адыграла ключавую ролю ў другім з'яўленні Жыровіцкай іконы. Пасля ўрокаў дзеці выпадкова зайшлі на пагорак і ўбачылі дзіўную карціну: на камені сядзела Божая Маці, атачоная незямным ззяннем, а ў руках у яе была страчаная ў пажары ікона. Дзеці пабеглі ў вёску, каб паклікаць дарослых. Калі яны вярнуліся туды, то Багародзіцы ўжо не было, затое на камені застаўся цудатворны абраз. На гэтым месцы ў XVII ст. была пабудавана Яўленская царква. Гэты камень тут таксама застаўся да нашых дзён у алтары пад пасадам.

Калі прайсці крыху далей ад Яўленскай царквы, то па дарожцы можна выйсці наўпрост да Крыжаўзвіжанскага храма. Ён мае неўласцівую для праваслаўнай царквы архітэктуру. Тлумачыцца гэта тым, што на працягу 200 гадоў гэты храм быў уніяцкі. Што ў ім незвычайнага? Уся справа ў лесвіцы, якая займае палову ўнутранай прасторы будынка. Яна з'яўляецца копіяй Святых усходаў з Латэранскай базілікі Св. Іаана ў Рыме. Раней існавала традыцыя, у адпаведнасці з якой паломнікі на каленях уздымаліся па дваццаці васьмі прыступках Святой Лесвіцы, суправаджаючы свой шлях адмысловымі малітвамі. І таму ў кожнай прыступцы былі закладзены мошчы рускіх святых. Але ж традыцыя адышла ў мінулае, і святыя часціцы перанеслі ў іншае месца.

Сёння Жыровіцкі манастыр па праве лічыцца адным з галоўных цэнтраў беларускага праваслаўя. Апроч храмаў, тут таксама ёсць святыя крыніцы, эдэмскі сад, Мінская духоўная семінарыя, музей. Да таго ж для паломнікаў тут прадугледжаны спецыяльныя гасцініцы.

Дзіва глыбінкі

Асаблівы дух пануе ў вясковых цэрквах. Здаецца, усё такое роднае і хатняе, што ўзнікае жаданне затрымацца тут даўжэй. Такое адчуванне засталося і пасля яшчэ аднаго пункта нашага падарожжа — Царквы Прасвятой Багародзіцы ў аграгарадку Лыскава.

Знешне яна ўражвае незвычайнай архітэктурай, у якой прысутнічаюць рысы культавай архітэктуры Закарпацця і стылю мадэрн. А ўнутрана — прыхаджанамі, якія робяць гэтую царкву асаблівай. «Золата ў нас няма — людзі золата», — так гаворыць аб сваім прыходзе **настаяцель храма Аляксандр БАГДАНОВІЧ.** Дарэчы, ён служыць тут ужо больш за 40 гадоў і, здаецца, ведае ўсё аб гэтай цудоўнай царкве. Так, з любоўю і трапятаннем ён расказаў нам пра цікавую мясцовую святыню — камень, на якім выразна відаць выяву крыжа.

Раней было прынята, што крыж-ахоўнік стаяў у пачатку і ў канцы вёскі, а то і ў сярэдзіне. Але тут усё змянілася пры Хрушчове. Аднойчы Васіль, адзін з жыхароў вёскі, убачыў, што такога крыжа-ахоўніка няма. Прыйшоў у хату да жонкі сваёй Веры і кажа:

— Вера, крыжа няма — зрэзалі. Як будзем жыць далей?

— Як жылі, так і будзем жыць. Галоўнае, што крыж у сэрцы, — адказала яна.

Ноччу Васілю прысніўся сон: прыйшла да яго прыгожа апранутая жанчына і кажа: «Васіль, вось гэты так не зрэжуць», і паказвае на крыж. Ён прачнуўся і не зразумеў: як не зрэжуць, калі ўжо зрэзалі.

Назаўтра мужчына паехаў на поле араць. Праз некаторы час пачаў сыпаць дробны дождж, з-за чаго плугі глыбока лезлі ў зямлю. Раптам трактар заглух. З-за цемры нічога не было відаць, таму Васіль са сваім напарнікам не сталі разбірацца, у чым справа, і проста разышліся па дамах.

На наступны дзень Васіль машынальна сеў за руль трактара, і той раптам завёўся. Атрымліваецца, заглух ён зусім не з-за праблем з механікай: яго руху нешта перашкодзіла звонку. Пайшоў ён глядзець, што магло заглушыць трактар, і знайшоў пад плугам невялікі камень, які з-за сваіх памераў ніяк не мог спыніць такую машыну. Васіль ачысціў камень ад зямлі і ўбачыў на ім выяву крыжа. «Дык вось што спыніла!» — падумаў мужчына. Ён забраў гэты камень да сябе дадому, абмыў і захоўваў доўгія гады. Толькі перад сваёй смерцю пагадзіўся перадаць яго мясцоваму храму.

«Захоўваю як сведчанне, што цуд Гасподні заўсёды можа быць», — падсумаваў сваё апавяданне айцец Аляксандр.

А яшчэ самы сапраўдны цуд — гэта тое, што такія дзіўныя месцы знаходзяцца зусім побач з намі, у нашай прыгожай старажытнай Беларусі. Засталося толькі сабрацца ў невялікае паломніцтва, каб убачыць усё гэта на свае вочы і адчуць кожную святыню сваёй душой.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

НА СТО ГАДОЎ НАЗАД

адкрыўся новы музей

фотаздымкі драўлянай забудовы канца XIX — пачатку XX ст., арыгінальную драўляную ліштву і шыльдачкі з дамоў, якія, на жаль, ужо зніклі.

У другім доме наведвальнік трапляе ў інтэр'еры стагадовай даўніны: тут адноўленая абстаноўка кватэр сям'і служачага Лібава-Роменскай чыгункі Канстанціна Андрэеўскага і сям'і рабочага-рэвалюцыянера Іосіфа Голубева. Рэканструкцыя кватэры Голубева, між іншым, была зроблена паводле кнігі яго ўспамінаў 1916—1923 гг. «Шчасце маё...»

Кожная рэч тут мае векавы ўзрост. Лялька, якая сядзіць на скураной канапе, піяніна, манекен, знойдзены на гарышчы аднаго з дамоў Паўночнага завулка, посуд — адзін з кубкаў, частку сервіза «Шасцярэнькі», упрыгожаны супрэматычнымі матывамі,

можна пабачыць на фотаздымку сям'і Андрэеўскіх 1930-х гадоў. Усё тут перададзена былымі жыхарамі Паўночнага завулка, кожная рэч памятае дотыкі рук колішніх мінчукоў: гульня «Лато» — добра захавалася вышываная торбачка з бочачкамі і скрынка з картамі, прас, грамафон, швейная машынка, калодкі для вырабу абутку, бляшанка ад цукерак фабрыкі «Камунарка»... А вось што гэта за рэч, не кожны здагадаецца: шкляны сасуд з паперкамі з лічбамі ўнутры — насамрэч гадзіннік-каляндар, які належаў Іосіфу Голубеву.

У трэцім будынку — выстава прац беларускай мастачкі Галіны Азгур, жонкі народнага мастака СССР і Беларусі Заіра Азгура. На адным з пейзажаў можна пабачыць і сілуэт самога славутага скульптара.

Наведаць новы музейны комплекс, пазнаёміцца з гісторыяй Мінска, перанесціся ў атмасферу пачатку XX стагоддзя можна з серады да нядзелі, з 11.00 да 19.00.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды **сроком на три года** имущества, находящегося в собственности Республики Беларусь и переданного **ОАО «Криница»** (Продавец) по договору безвозмездного пользования

Аукцион состоится **24.10.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:
Право заключения договора аренды части здания транспортной проходной зоны выезда с инв. № 500/С-25376.
Площадь, сдаваемая в аренду, – 109,4 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 462,76 руб.

Лот № 2:
Право заключения договора аренды части здания транспортной проходной зоны выезда с инв. № 500/С-25376.
Площадь, сдаваемая в аренду, – 517,40 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 2 188,60 руб.

Адрес Лотов № 1 – № 2: г. Минск, ул. Радиальная, 52/14.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

